Літаратурная Беларусь

Выпуск №3 (103) (сакавік)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas. info

Змест

Хто ацэніць Вялікі беларускі раман?

Галоўная праблема беларускай літаратуры добра вядомая: улады чыняць перашкоды на ўсіх дарогах і сцежках яе развіцця.

Перадусім нацыянальную літаратуру забаронена выкладаць у поўным аб'ёме ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах (так, у 1996 годзе з праграмаў былі выкінутыя ўсе пісьменнікі-эмігранты), а стварэнне свабоднага камерцыйнага кніжнага рынку ў краіне сур'ёзна абмежавана (узгадаем суд над кнігаром Логвінавым).

Але гэта вонкавае зло, так бы мовіць, звыклае: яно пераследуе беларускую літаратуру з першых дзён існавання. Толькі адзін факт: у 1903 годзе Круг беларускай народнай прасветы і культуры (арганізацыя дзейнічала у Санкт-Пецярбурзе) выдаў Янку Лучыну як... балгарскага паэта, каб толькі абысці расейскую цэнзуру.

Нашмат жахлівей для нацыянальнай літаратуры цяпер іншае. Новае кіраўніцтва Беларусі вырашыла пайсці далей за сваіх «папярэднікаў», царскі і камуністычны рэжым: паступова і мэтанакіравана яно пазбаўляе беларускую літаратуру чытача.

Раман як грамадскі праект

Напрыканцы мінулага года ў беларускіх СМІ, а таксама блогасферы і сацыяльных сетках вялася спраўкаваная кіраўніком краіны палеміка пра неабходнасць і магчымасць Вялікага беларускага рамана — эпапеі накшталт «Войны и мира». Аднак галоўнае пытанне тады не было абмеркаванае: ці будзе ўспрыняты беларускім чытачом Вялікі беларускі раман, калі з'явіцца?

Узорны эпічны раман, як «Будэнброкі» Томаса Мана ці «Людзі на балоце» Івана Мележа — не толькі выкшталцоны з гледзішча формы і зместу літаратурна-мастацкі тэкст; бездакорная мова, спеласць аўтарскай думкі і пачуццяў, выразная маральна-філасофская праблематыка, псіхалагічна дакладныя вобразы, аб'ёмная панарама эпохі, гістарызм і інш. Гэта найперш аповед, насычаны яснымі, зразумелымі кодамі для чытачоў, мастацкі і адначасова грамадскі праект. Маральныя, інтэлектуальныя пошукі раманіста і чытацкай аўдыторыі супадаюць, і нездарма чытачы ўспрымаюць аўтара Вялікага рамана як прыхільніка, выразніка іх каштоўнасцяў, аб чым яскрава сведчыць гісторыя сусветнай літаратуры.

Сапраўдны раман адразу робіцца з'явай жыцця грамадства і ў найноўшыя часы. Яго стварэнне стаіць у адным шэрагу, прыкладам, з прыняццем направак у Падатковы кодэкс краіны, будаўніцтвам новай сеткі дарог, рэформай сістэмы адукацыі і іншымі значнымі агульнаграмадскімі падзеямі.

Так, у Германіі ўвагу чытачоў цяпер захапіў раман Луца Зайлера «Рабінзон», які напрыканцы 2014 года атрымаў прэстыжную Нямецкую літаратурную прэмію (Deutscher Buchpreis). У сваім 500-старонкавым творы Зайлер распавядае пра выспу Хідэнзе ў Балтыйскім моры, дзе ў часы ГДР знаходзілі прытулак людзі, якія па тых ці іншых прычынах не «падыйшлі» сацыялістычнаму рэжыму. Тэма свабоды асобы ў часы існавання ГДР — вельмі балючая для немецкай нацыі. Не дзіва, што раман-напамін атрымаў шырокі розгалас, запачаткаваў новыя дыскусіі.

«Мы, беларусы...»

Сучаснае беларускае грамадства страшэнна раструшчанае, разбітае на кавалкі, лакальныя групы і падгрупы, клубы па зацікаўленням. Мы не адчуваем і, адпаведна, не паводзім сябе як нацыя, мы не функцыянуем гэтак зладжана, як пчаліны вулей.

Так, нас па-ранейшаму яднае геаграфічнае месца пражывання, але ж толькі гэта ў нас і ёсць — далей пачынаецца тэрыторыя адрозненняў, несумяшчальных інтарэсаў і зацікаўленняў, прыхаванага ці адкрыта варожага стаўлення адзін да аднаго.

Грамадствам нас можна назваць таму, што мы ўяўляем сабой сукупнасць адзінак, асобаў. Прычым сучаснае беларускае грамадства абсалютна не прызнае аніякіх аўтарытэтаў: ні ў жыцці, ні ў палітыцы, ні нават у культуры. Кожны сам сабе гаспадар...

Духоўныя ж лідары Беларусі, уключна з выдатнымі пісьменнікамі, фактычна засталіся ў мінулым часе, у прасторы па-за намі. І калі адны беларусы працягваюць чытаць Васіля Быкава, то другія цяпер адкрыта (о, бессаромнае стагоддзе!) прыгадваюць, што з нудою гарталі яго творы ў школе, трэція — «глынаюць» за адну ноч які-небудзь «Гнеў Наваросіі» Георгія Савіцкага (падобнай прадукцыяй завалены беларускія кніжныя кірмашы — попыт спараджае прапанову).

Раман — гэта не толькі сцяг агульных ідэяў, думак і перажыванняў, пад якім па добрай волі шыхтуюцца чытачы-грамадзяне, але і агульная мова, агульныя літары і сэнсы. Беларусы не могуць пачуць адзін аднаго, пакуль іх мова адрозніваецца, не супадае, пакуль у іх «дзве душы».

Новае кіраўніцтва Беларусі вырашыла пайсці далей за сваіх «папярэднікаў», царскі і камуністычны рэжым: паступова і мэтанакіравана яно пазбаўляе беларускую літаратуру чытача

Нядаўна мой знаёмы пісьменнік са скрухаю распавядаў мне пра рускамоўны раман, дзе апісваецца жыццё вёскі — кніга рыхтуецца да друку, і мой знаёмы прымае ўдзел у яе выданні як рэдактар. «Як можна пісаць па-руску твор пра беларускую вёску?» — пытаецца ён і не знаходзіць адказу.

Між тым двухмоўе — норма ў Беларусі, а насамрэч яшчэ адна лінія разлому нацыянальнай псіхікі...

9 мільёнаў Лявонаў Бушмароў

Мы, беларусы, гаворым на розных мовах, жывем кожны ў сваім свеце, вызнаем асабістыя каштоўнасці. Кожны цяпер у апазіцыі да суайчыннікаў і ўсяго свету — суцэльны лясісты край зяравата-панурых Лявонаў Бушмароў, «мая хата з краю», «за адзін кацёл я ні з кім не сяду».

Аднак мы забыліся, што не заўсёды былі такія, што гэтае раз'яднанне, разрыў усіх камунікацыяў і сувязяў у грамадстве адбыліся насамрэч не па нашым жаданні, без нашай на тое згоды. Кіруючы рэжым прыкладае ўсе намаганні, каб адзінства і еднасці ні ў якім выглядзе, форме (у тым ліку мастацкай) на гэтай зямлі не было. І ў першую чаргу мусіць быць парушаны, скажоны беларускі культурны код — такая стаіць задача.

Бачачы, што кантраляваць пісьменніцкі розум не дужа атрымліваецца, улады вырашылі пазбавіць розуму чытача літаратуры (найперш з ліку сярэдняга класу), скалечыць яго невуцтвам, прапагандай, галечай, цяжкай і нізкааплатнай працай. Каб ён наагул адмовіўся ад чытання, палічыў яго заняткам, не вартым дробнага шэлега, каб ён не пабачыў у раманах сваіх думак, спадзяванняў, надзей і аказаўся няздольны весці дыялог з аўтарам і іншымі чытачамі.

У гэтых сацыяльна-палітычных варунках цяжка ўявіць, што нашы людзі змогуць належным чынам ацаніць Вялікі беларускі раман, які ў выпадку яго стварэння сапраўды здольны «даць красу, даць мысль, паднімаць і весці душы» (Вацлаў Ластоўскі), дапамагчы беларусам пачуваць сябе грамадою, з усёй глыбінёю і адказнасцю ставіцца да сваіх грамадзянскіх абавязкаў. Як адбывалася гэта раней у нацыянальнай літаратуры, калі ў яе былі беларускамоўныя чытачы, не «апрацаваныя» дашчэнту ўладамі, чытачы, якія разумелі і цанілі раманы найперш за адчуванне еднасці праз выкшталцонае мастацкае слова з нацыянальнай гісторыяй і культурай.

Верагодна, у новым Вялікім беларускім рамане, роўным «Каласам пад сярпом тваім» і «Камароўскай хроніцы», гаворка пойдзе менавіта пра раз'яднанне — хваробу, што стачыла беларускае Дрэва жыцця. Верагодна, гэты новы эпічны твор будзе напісаны так прыгожа, моцна і пераканальна, што ўсе мы, ацалелыя чытачы, паасобку адчуем і зразумеем: тое сапраўды наша агульная хвароба. І што нас заразілі наўмысна, скарыстаўшыся нашымі страхамі, крыўдамі, недаверам, няўпэўненасцю...

А магчыма, Вялікі беларускі раман пішацца ўжо сёння, і насамрэч гэта вялікая сукупнасць твораў — падобна таму, як нацыю ўтварае мноства людзей, якія спавядаюць адзіныя ідэалы, ідэі і прынцыпы, чый культурны код — адзіны і без расколінаў.

Павел Абрамовіч

«Пуціна» ў Мінску

У мінскай галерэі «Ў» адбылася прэзентацыя новай празаічнай кнігі Барыса Пятровіча «Пуціна». Сустрэча прайшла ў межах Марафону падтрымкі кнігарні «логвінаЎ», яе наведалі блізкія і сябры, калегі і паплечнікі аўтара, а таксама чытачы і прыхільнікі ягонай творчасці.

У кнігу «Пуціна» ўвайшлі дзве аповесці, што былі напісаныя раней, аднак дапрацоўваліся цягам гадоў і ўпершыню, пад адной вокладкай, выйшлі нядаўна ў выдавецтве «Кнігазбор».

Пытанні, закранутыя празаікам у аповесці «Стах», датычныя рэфармавання нацыянальнай свядомасці пасля 1994 года, шляхоў развіцця беларускай культуры, — не страчваюць актуальнасці і цяпер, і пакуль не ясна, на жаль ці на радасць, зазначыў Барыс Пятровіч.

Але, акрамя вонкавага сюжэту, які апісвае грамадскія рэаліі пачатку 1990-х, вялікую ўвагу, па словах крытыкаў, чытачам варта звярнуць на філасофскі падтэкст, на вобраз Стаха, галоўнага героя, падобнага да Сартраўскіх персанажаў экзістэнцыялізму.

Хрысціянскія матывы, канфуцыянства, будызм — вельмі розныя канцэпты ўзаемадзейнічаюць у аснове трыпціха «Стах». Аўтар распавёў, што многае ў творы з'яўляецца мастацкай выдумкай, і, магчыма, гэта было нязвыкла для прыхільнікаў рэалістычнай літаратуры, асабліва ў часы 1990-х, калі адна з частак аповесці была апублікаваная ў перыёдыцы ўпершыню.

Цягам прэзентацыі Барыс Пятровіч зачытваў фрагменты з аповесцяў, расказваў пра гісторыю іх напісання і пра тое, што з'яўляецца фантасмагарычным, а што ўзятае з рэальнасці.

У выступленнях узялі ўдзел Сяргей Законнікаў, Леанід Галубовіч, Андрэй Федарэнка, дзядзька пісьменніка Алесь Сачанка, Сяргей Дубавец, Людміла Рублеўская, Алесь Пашкевіч. Аўтар і выканаўца ўласных песень Алесь Камоцкі забяспечыў музычную частку імпрэзы.

Прэзентацыя завяршылася аўтограф-сесіяй.

Паводле lit-bel.org

Літаратурны конкурс імя Рыгора Барадуліна

24 лютага, у дзень, калі Народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну споўнілася б 80 гадоў, ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» абвясціў пра пачатак прыёму прац на конкурс «Экслібрыс».

Да ўдзелу ў конкурсе імя Рыгора Барадуліна запрашаюцца паэты і перакладчыкі паэзіі на беларускую мову ва ўзросце да 30 гадоў.

Журы конкурсу: Раіса Баравікова, Леанід Дранько-Майсюк, Вольга Іпатава, Наталля Кучмель і Уладзімер Някляеў.

Пераможцы будуць вызначаны ў дзвюх намінацыях: «Паэзія» і «Паэтычны пераклад на беларускую мову».

Свае вершы і пераклады на конкурс дасылайце адным файлам у фармаце .doc да 1 жніўня 2015 года на адрас sbp@lit-bel.org, пазначыўшы тэмай ліста «Конкурс». Файл назавіце сваім прозвішчам лацінскімі літарамі. У лісце мусіць быць наступная інфармацыя: імя, прозвішча, дата нараджэння ўдзельніка, кантактны нумар тэлефона і e-mail.

За ходам конкурсу сачыце на сайце lit-bel.org.

КРАСАВІЦКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

Алена Уладзіміраўна Таболіч (нар. 15.04.1940)
Анатоль Канстанцінавіч Клышка (16.04.1935)
Віктар Апанасавіч Казько (23.04.1940)

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!



Нявыдуманая літаратура: Беларусь – Швецыя

На пачатку сакавіка інтэлектуальны Мінск стаў цэнтрам гутарак пра сутнасць і адметнасць нявыдуманай літаратуры (або так званай літаратуры нон-фікшн).

Анэт Розэнгрэн, Катарына Б'ярвал, Генрык Бергрэн

Разам з беларускімі аўтарамі і літаратуразнаўцамі аб тым разважалі пісьменнікі са Швецыі Анэт Розэнгрэн, Катарына Б'ярвал і Генрык Бергрэн.

Пакуль у Беларусі ідзе пошук дакладнага вызначэння, што ўключаць у літаратуру нон-фікшн, шведы ўжо даўно вызначыліся, аб'яднаўшы ў гэты «падвід» і сацыяльныя даследаванні, і біяграфіі, і кнігі па кулінарыі.

3 сакавіка ў мінскім музеі Петруся Броўкі шведскія пісьменнікі правялі з беларускімі калегамі сустрэчу пад назвай «Шведская літаратура нон-фікшн: тэмы і праблемы». Мадэравала сустрэчу Наталля Гардзіенка, старшыня секцыі непрыдуманай літаратуры Саюза беларускіх пісьменнікаў.

У краіне, дзе да свабоды слова ставяцца звышсур'ёзна, няма недакранальных тэм для даследчыкаў любой галіны.

У межах сустрэчы Генрык Бергрэн распавёў, што ў Швецыі продажы кніг даволі істотна скараціліся за апошні час. Але рэч не ў тым, што чытачы перайшлі на электронныя выданні. Па меркаванні Бергрэна, тут адыграла сваю ролю зніжэнне цікавасці да літаратуры наогул: «Цяпер людзі больш сядзяць праз свае гаджэты ў інтэрнэце, чым чытаюць кнігі».

Вялікім сегментам кніжнага рынку Г. Бергрэн назваў кнігі па кулінарыі: «Гэта дзіўна, бо ў нас мала хто мае час, каб гатаваць вячэру. Не ведаю, хто іх купляе».

Сапраўдным бэстсэлерам сярод дакументальных кніг старшыня секцыі нон-фікшн Шведскага саюза пісьменнікаў Анэт Розэнгрэн назвала кнігу двух журналістаў, якія апісалі свае 438 дзён у турме Эфіопіі.

Але часцей шведскія пісьменнікі літаратуры нон-фікшн звяртаюцца да лакальных падзей. Цікавымі замежнаму чытачу тэмамі А. Розэнгрэн назвала пытанні месца жанчыны ў шведскім соцыуме, тэмы грамадскай ізаляцыі і міграцыі, праблемы ЛГБТ супольнасці.

Анэт і сама задала некалькі пытанняў беларускім пісьменнікам. Яе цікавіла, ці наведваюць беларускія аўтары дзеля сваіх даследаванняў іншыя краіны, і ці плануецца якое выданне да чарговай гадавіны выбуху на ЧАЭС.

«У гісторыі Швецыі мала драматызму. Напэўна, таму нашай гістарычнай літаратурай складана зацікавіць чытача. А гісторыя Беларусі насамрэч можа стаць папулярнай», – адзначыла літаратарка.

А. Розэнгрэн падкрэсліла, што ў Швецыі бракуе перакладаў беларускіх твораў і кніг пра Беларусь. «Нашыя краіны падобныя па плошчы і насельніцтву. Мне падаецца, што яны могуць добра дапаўняць адна адну», – сказала Анэт.

На наступны дзень шведскія і беларускія пісьменнікі сустрэліся ў мінскай кнігарні «ЛогвінаЎ», каб абмяркоўваць сацыяльна-культурную праблематыку ў літаратуры нон-фікшн і журналістыцы Швецыі і Беларусі.

Пакуль у Беларусі ідзе пошук дакладнага вызначэння, што ўключаць у літаратуру нон-фікшн, шведы ўжо даўно вызначыліся, аб'яднаўшы ў гэты «падвід» і сацыяльныя даследаванні, і біяграфіі, і кнігі па кулінарыі

У дыскусіі ўзялі ўдзел госці са Швецыі, літаратаркі Катарына Б'ярвал і Анэт Розэнгрэн, да якіх далучыліся беларускія аўтары Валер Каліноўскі, Паліна Качаткова, Уладзімір Сіўчыкаў, Аляксандр Тамковіч, Сяргей Харэўскі, Ціхан Чарнякевіч.

А 5 сакавіка ў галерэі «Ў» прайшоў семінар «Біяграфічная літаратура ў Швецыі і Беларусі». У абмеркаванні актуальных пытанняў развіцця біяграфічнай літаратуры ўзялі ўдзел гісторык, журналіст са Швецыі Генрык Бергрэн і беларускія аўтары Альгерд Бахарэвіч і Аляксандр Тамковіч.

Біяграфію складана аднесці да пэўнага жанру літаратуры. Яна знаходзіцца на мяжы паміж гістарычным, журналісцкім даследаваннем, мастацкім творам, эсэ.

«Яшчэ працуючы ў газеце, – распавёў Генрык Бергрэн, – я пачаў пісаць работу, прысвечаную вывучэнню жыццёвага і прафесійнага шляху прэм'ер-міністра Швецыі Улафа Пальме, якая пазней ператварылася ў паўнавартасную біяграфію. Ён быў вельмі незвычайным палітыкам, інтэлектуалам з моцным пачуццём маралі, надзвычай разумным тактыкам.

Я адразу ведаў, што хачу напісаць яго біяграфію — гэта выдатная магчымасць распавесці пра асобу і ў той жа час паставіць яе ў шырокі гістарычны кантэкст. Праца над гэтай кнігай доўжылася каля 5 гадоў. Я паспрабаваў паглядзець не толькі на самога Улафа Пальме, але і людзей вакол яго: кім яны былі, што думалі, як уплывалі на асобу прэм'ер-міністра».

Біяграфічная кніга Г. Бергрэна пра Улафа Пальме вельмі хутка стала папулярнай. Яна разышлася тыражом больш як 100 тысяч і была перакладзеная на шэсць моў. Варта адзначыць, што біяграфічнае даследаванне Г. Бергрэна, прысвечанае Улафу Пальме, не так даўно пабачыла свет і па-беларуску. Кніга выйшла ў выдавецтве Зміцера Коласа. Сам спадар Зміцер таксама прысутнічаў на сустрэчы і зазначыў, што выданне біяграфій выдатных дзеячаў з іншых краін — вельмі добры спосаб адукоўваць суайчыннікаў.

Наталля Гардзіенка заўважыла, што ў сучаснай беларускай літаратуры нон-фікшн можна прыгадаць не так шмат кніг, якія былі б паўнавартаснымі біяграфіямі. Але ёсць аўтары, якія звяртаюцца да біяграфістыкі ў зборніках эсэ, газетах, часопісах, робяць інтэрв'ю. Ёсць асобы, якія прапануюць новы погляд на творчыя здабыткі вядомых аўтараў, творцаў.

А. Розэнгрэн, старшыня секцыі нон-фікшн Шведскага саюза пісьменнікаў, распавяла, што ў Швецыі сёння біяграфічная літаратура на ўздыме папулярнасці. Цікавяцца і кнігамі, у якіх простыя людзі распавядаюць, як яны знайшлі выйсце са складаных жыццёвай сітуацыі, да прыкладу, перамаглі рак ці перажылі смерць блізкага чалавека.

Паводле lit-bel.org

15 сакавіка пайшоў з жыцця пісьменнік, сябар СБП Аркадзь Іосіфавіч Нафрановіч. Смуткуем і выказваем спачуванні родным і блізкім.

***

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае сардэчныя спачуванні сябрам Рады арганізацыі пісьменнікам Валянціне Аксак і Уладзімеру Арлову з прычыны смерці іх бацькі і цесця. Вечная памяць!

Верыць людзям і жыццю

Да 90-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта з Беласточчыны Віктара Шведа

Вёска Мора на Беласточчыне – гэта радзіма старэйшага беларускага паэта Віктара Шведа, якому 23 сакавіка споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння.



Пяць гадоў таму мы трымалі ў руках яго прыгожую і шчырую кнігу вершаў «Адплываем з Мора». Ужо тады паэт пісаў, што амаль усе яго сваякі з роднай вёскі Мора адплылі ў іншы свет, а цяпер наступае яго чарга. Я напісаў артыкул пра той зборнік вершаў і назваў яго «Адплываць з Мора яшчэ рана». Ды куды адплываць, калі наперадзе шмат спраў, планаў, літаратурных задумак і адкрыццяў?!. Эрнэст Хэмінгуэй некалі напісаў празаічны твор «Стары і мора». Калі б сёння жыў прадзядуля Хэмінгуэй і калі б ён сваё апавяданне прысвяціў Віктару Шведу, то назваў бы яго не інакш, як «Малады чалавек і Мора». Бо Віктар Швед, нягледзячы на свае дзевяць дзясяткаў гадоў, заўсёды малады, прыгожы, шчаслівы, натхнёны, і нам, маладзейшым літаратарам, застаецца толькі яму пазайздросціць, браць з яго прыклад, вучыцца ў яго літаратуры і аптымізму. А роднае яму Мора па-ранейшаму натхняе яго на новыя творы, вяртае ў маленства і юнацтва, якія не даюць яму старэць і падаць духам. Вось такі ён, Віктар Швед.

А яшчэ ён вельмі шчыры беларус. Пра гэта паэт адкрыта і публічна сказаў ажно ў 1957 годзе, калі ў беларускім тыднёвіку «Ніва» апублікаваў свой першы верш «Я – беларус». І пра тое, што ён – беларус, што мова наша беларуская, што мы павінны гэтым ганарыцца, паэт піша ў кожным паэтычным зборніку. Нацыянальная тэма скразной лініяй праходзіць праз усю творчасць Віктара Шведа.

Ён – пясняр беларускай вёскі на Беласточчыне. Сваёй роднай вёсцы Мора прысвяціў дзясяткі паэтычных радкоў. Шмат створана настальгічных вершаў пра вясковае маленства і юнацтва, пра тыя гады, калі беларуская вёска сапраўды была вялікай, гаманлівай, таленавітай, народнай і дружнай. Толькі сапраўдны паэт можа так апісаць вёску свайго маленства, як гэта рабіў неадноўчы Віктар Швед. Ну, скажыце, чым не хрэстаматыйныя радкі:

Дзедаўская хата
Поўна экспанатаў.
З карэннаў калыска,
Гліняная міска,
Драўляная лыжка,
Двайная гладышка,
Святыя іконы,
Круглы серп зублёны,
Вялікія кросны,
Кадаўбец дзівосны,
Каменныя жорны,
Дзяжа на хлеб чорны,
Стары калаўротак,
Са споўніцай мотак,
Гладка качалка,
Крэсіва-запалка...

Дабрата, шчырасць, інтэлігентнасць духу – вось тыя рысы, якія вызначаюць сёння характар лірычнага героя Віктара Шведа. Гэтыя рысы прысутнічаюць у зборніках вершаў «Жыццёвыя сцежкі» (1967), «Дзяцінства прыстань» (1975), «Дружба» (1976), «Мая зялёная Зубровія» (1990), «Родны сход» (1991), «Wiersze wybrane» (1997), «Выбраныя вершы» (2000), «Lata wiatr skrzydlaty» (2000), «Мае Айчыны» (2003), «Адплываем з Мора» (2010) і ў іншых. Віктар Швед не мудрагеліць у паэзіі, не філасофствуе над праблемамі і чалавечым жыццём. Ён заўсёды быў і застаецца прыхільнікам традыцыйнай паэзіі.

Чытаючы вершы Віктара Шведа, адчуваеш жывую душу чалавека, яго імкненне сказаць сваё запаветнае. Яго вершы абуджаюць думку і пачуццё. Паэтычны свет беларускага паэта з Беластока – гэта свет сціпласці, стрыманых пачуццяў і замілавання някідкай прыгажосцю жыцця. Паэт – у лепшых і найбольш характэрных для яго творах – настройвае нас на хвалю нейкай асаблівай спагадлівасці, даверлівай шчырасці. З ім, з яго лірычным героем прыемна быць побач: радавацца жыццю і перажываць яго неўладкаванасць, верыць у шчасце, у будучыню, смуткаваць аб праляцелай маладосці і трывожыцца за будучыню не толькі Беларусі, а ўсяго свету, арганічна і проста быць сваім сярод людзей, сваім і пры нялёгкім успаміне, і ў хвіліну весялосці.

Паэт усё ж заўсёды верыць людзям і жыццю. Ён стараецца прапаведаваць шчырасць і натуральнасць чалавечых узаемаадносінаў і заўсёды горнецца душою да нас, яго чытачоў, запрашаючы да ўзаемнасці і паразумення.

Шмат вершаў Віктар Швед прысвяціў сваім землякам, сябрам, знакамітым беларусам, якія жывуць з ім побач і якіх даўно няма. Многіх з іх ён асабіста ведаў, сустракаўся, сябраваў. Праз яго паэтычныя радкі праходзяць такія асобы, як прафесар Васіль Белаказовіч, Васіль Быкаў, Кастусь Майсеня, Ада Чачуга, Яўген Міклашэўскі і дзясяткі іншых. Ён напісаў і апублікаваў шэраг артыкулаўуспамінаў пра тых людзей, якіх ведаў у Польшчы, Беларусі і ў іншых краінах свету.

Віктар Швед у сваіх вершах заўсёды паэтызуе пагодненасць сэрцаў, узаемны давер і рашуча адмаўляе няшчырасць і здраду. Без суладдзя з дабратой, чалавечнасцю для яго немагчымы свет, разбураюцца сувязі не толькі паміж людзьмі, але і паміж чалавекам і прыродай.

Шмат паэтычных радкоў Віктар Швед прысвяціў дзецям. З друку выйшлі яго кнігі вершаў «Вясёлка» (1991), «Вершы Натальцы» (1998), «Смяшынкі» (2009) і іншыя. Асабліва папулярныя на Беласточчыне яго вершы-смяшынкі, якія аўтар пастаянна друкуе на старонках беларускага тыднёвіка «Ніва». Як сказала неяк Тэрэза Занеўская, у смяшынках Віктара Шведа «бацькам у люстры адбіваюцца з'явы штодзённага жыцця і цэлае багацце сітуацый, якое яно нясе з сабой». Героямі вершаў-смяшынак паэта з'яўляюцца дзеці, дарослыя, жывёлы, з'явы прыроды – усе разам яны захапляюць чытачоў сваім гумарам і настроем. Вось адзін з такіх вершаў-смяшынак:

Пытае мама сынка Колю:
— Як адчуваеш сябе ў школе?
Адказвае сыночак маці:
— Быццам у камісарыяце:
Там, мая мама дарагая,
Усё пытаюць і пытаюць.
Пытаюць часта, надта многа...
А я не ведаю нічога.

Сёння пра творчасць юбіляра можна разважаць доўга. Бо за 90 гадоў перажыта, напісана і надрукавана вельмі шмат. Паэт заўсёды даражыў і даражыць творчай радасцю, верыў і верыць у беларускае слова, яго вялікія магчымасці і дзейсную сілу. Таму ён і бадзёрым сустракае свой вялікі ЮБІЛЕЙ. З чым яго шчыра і віншую!

Сяргей Чыгрын

Душа паэта

(З прадмовы да «Выбраных вершаў» Віктара Шведа)

...Адгрымела другая сусветная вайна, канчаткова вызначыўшы межы Польшчы і Беларусі. Ці захавала насельніцтва гэтага краю свае звычаі, абрады, мову і песні? Нешта захавала. Беларускія сяляне могуць яшчэ і паразмаўляць па-беларуску, і паспяваць у застоллі свае спрадвечныя песні. А вось моладзь... Яна асімілявалася.

У беларусаў няма імунітэту ад асіміляцыі, ад разбурэння свайго нацыянальнага ўкладу жыцця і страты духоўнай спадчыннай культуры. Такімі зрабіў беларусаў на працягу некалькіх апошніх стагоддзяў іх гістарычны лёс.

Беларусы ў Польшчы — нацыянальная меншасць, і асіміляцыя тут — з'ява як быццам што заканамерная. Аднак у Польшчы ёсць і беларускія падставовыя школы, гімназіі і ліцэі, а ў Варшаўскім і Беластоцкім універсітэтах — аддзяленні (кафедры) беларускай філалогіі. Але куды можа паехаць беларуская моладзь беластоцкага краю, каб паслухаць жывую беларускую мову і ўдасканаліць веды па ёй? У Рэспубліку Беларусь? Там — таксама асіміляцыя. У гарадах і пасёлках Беларусі беларускай мовы не пачуеш. Трэба ехаць у палескую вясковую глуш. Можа, там пашанцуе пачуць калі не беларускую, дык беларуска-ўкраінска-рускую ці палескую мову.

Такая рэальнасць...

У зборніках вершаў Віктара Шведа шмат старонак адведзена працэсу асіміляцыі беларусаў беластоцкага краю. Лірычны герой Віктара Шведа, прататыпам якога, бясспрэчна, з'яўляецца сам паэт, — беларус, надзелены інтэлектам захавальніка і апантанага абаронцы нацыі, адзін з нешматлікіх носьбітаў нацыянальнай свядомасці і духу беларускага этнасу, і яго боль і перажыванні, звязаныя з гэтым трагічным і, хутчэй за ўсё, вырашальным працэсам у гісторыі беларускага народа, не пакінуць чытача абыякавым.

Паэт у форме вершаў занатоўвае ўсе свае назіранні — ад успамінаў пра казачна-шчаслівыя дні бясхмарнага дзяцінства да чалавечых перажыванняў і шкадаванняў, выкліканых непазбежным прыходам даждлівай і невясёлай пары сталасці, скрухі і пакутлівага роздуму, няўмольнага разбурэння чалавечай асобы самім жыццём.

Кожны чалавек перш-наперш цікавы тым, што і як ён робіць, якія будуе палацы, рэальныя і паветраныя, што вынаходзіць і ўдасканальвае, пра што марыць і да чаго імкнецца. А калі ён — творца і сваім талентам прыпісаны да сферы літаратуры ці мастацтва — тым больш.

Той, хто пазнаёміцца з вершамі Віктара Шведа, нават не з'яўляючыся ганаровым членам клуба апантаных прыхільнікаў класічнай ці мадэрнісцкай паэзіі, зацікавіцца і асобай самога паэта. А гэта ўжо нешта значыць...

Непаўторнае хараство прыроды і любай жанчыны, радасць сустрэчаў і смутак расстанняў, невыказны боль па беззваротных стратах, чалавечыя крыўды і абурэнне, захапленне і расчараванне, — усё, што прымушае хвалявацца і непакоіцца, любіць і ненавідзець, не абышло засяроджанай увагі і дапытлівага розуму і неспакойнай, як і сам час, душы паэта.

«Я нарадзіўся беларусам» — так называецца адзін з вершаў зборніка. Аднак Віктар Швед нарадзіўся не толькі беларусам, але і паэтам. І, нягледзячы на тое, што ён усё жыццё працаваў у сферы культуры, працаваў у розных установах і на розных пасадах, ён з поўным правам можа сказаць: «Мая прафесія — паэт»...

Прырода надзяліла яго незвычайна чуйнай і пяшчотнай душой, якая выяўляе сябе ў кожным вершы, і яе хваляванне пульсуе ў кожным радку, як электрычны ток, і вокамгненна перадаецца ўсім, хто іх пачуе ці прачытае. Так хваляванне паэта перакідаецца з аднаго сэрца на другое, як полымя.

Аднак Віктар Швед нарадзіўся не толькі паэтам, але і грамадзянінам. Можа таму грамадзянскія матывы яго паэзіі заўсёды робяць пэўнае ўздзеянне на розум і свядомасць чытача.

У творчасці Віктара Шведа яскрава акрэсліліся дзве тэматычныя сферы, да якіх ён пастаянна звяртаецца. Гэта — свет інтымных перажыванняў, трывога за свой асабісты лёс і такая ж неаслабная трывога за сваю нацыянальную супольнасць, за будучыню свайго народа і яго гістарычны лёс.

Паэтычны талент Віктара Шведа з тых жа глыбінь народнага духу, што і талент тысяч і тысяч народных песняроў, казачнікаў — безыменных стваральнікаў нацыянальнай духоўнай культуры народа. Паэзія для Віктара Шведа — гэта не інтэлектуальная гульня па законах высокага рамяства, гэта інтуітыўнае выяўленне праз прызму слова зменлівага і вельмі няўстойлівага стану чалавечай душы.

Яўген Міклашэўскі

Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў сардэчна віншуе свайго ганаровага сябра, вядомага беларускага паэта Віктара ШВЕДА з узнёслым юбілеем і шчыра жадае яму сакавіцкага здароўя, беларускай радасці і сонечнай натхнёнасці!

Імёны Свабоды

Паўстанец 1863 года: Генадзь Кісялёў

Дзве кнігі асвятлялі мой шлях у нацыянальны космас: раман «Каласы пад сярпом тваім» Уладзімера Караткевіча і томік гістарычных нарысаў «З думай пра Беларусь» Генадзя Кісялёва.

Насупор універсітэцкім падручнікам і лекцыям на нашым гістфаку БДУ гэтыя шчасліва адкрытыя мною кнігі сцвярджалі крамолу: гісторыю робіць не народ, а — асобы. І калі ў Караткевіча гэта былі літаратурныя персанажы, якія пакуль дарасталі да сваіх будучых дзеяў, то са старонак Кісялёва да нас прыходзілі рэальныя героі — з адрасамі, імёнамі, мянушкамі. Іх партрэты хацелася павесіць над сваім ложкам у інтэрнацкім пакоі.

Для мяне было вялікай нечаканкаю даведацца, што Генадзь Кісялёў нарадзіўся не ў Беларусі, а ў падмаскоўнай Каломне і што ягоны бацька-расеец амаль усё жыццё служыў у органах дзяржбяспекі. Дарэчы, гэтыя магутныя аргументы не раз выкарыстоўвалі рэдактары кніг Кісялёва, каб абараніць аўтара ад абвінавачванняў у нацыяналізме. Тое, што Генадзь Васільевіч атрымаў дыплом Маскоўскага гістарычна-архіўнага інстытута (у 1953 годзе, пазначаным у савецкім календары смерцю Сталіна), было аргументам слабейшым, бо гісторыкі і літаратуразнаўцы з вайсковымі званнямі ведалі гэтую навучальную ўстанову як «рассаднік вальнадумства».

Каб ураўнаважыць згаданы факт, некім была запушчаная думка, што Кісялёва накіравалі з Масквы менавіта ў Вільню, каб дапамагчы літоўскім таварышам перададолець ідэалагічныя хістанні. Мне думаецца, на выбар месца працы найперш паўплываў сам выпускнік: сказалі сваё слова і беларускія карані маці-віцябляНкі і тое, што ўжо ў віцебскай сярэдняй школе, якую пасля вайны закончыў Генадзь, ён захапіўся гісторыяй Беларусі. Але як бы там ні было, а паўтара дзесяцігоддзя, праведзеныя Кісялёвым на пасадзе супрацоўніка Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы, сталася для беларускай гісторыі і літаратуразнаўства шчасцем. Атмасфера нашай старажытнай сталіцы і яе архіўныя скарбы, памножаныя на магутны талент і апантанасць сваёй справаю, зрабілі Генадзя Кісялёва яшчэ да пераезду ў 1971-м у Менск выдатнай постаццю айчыннай навукі і культуры.

Наступнай сустрэчаю з Кісялёвым — зноў вяртаюся ў гады юнацтва — былі выдадзеныя да 100-годдзя паўстання Каліноўскага «Сейбіты вечнага», першая кніга майго ўжо ўлюбёнага аўтара. Яна чыталася, быццам гістарычны раман: «1863 года 7 сакавіка наглядчык за арыштантамі ў Пабернардынскім будынку жандарскі унтэр-афіцэр Скараходаў падаў у следчую камісію белую насавую хустачку, прынесеную з абедам да арыштаванага Карла Станкевіча (адзін з галоўных дзеячаў нелегальнай менскай паўстанцкай арганізацыі). На хустачцы было напісана алоўкам выяўленне нязменнай любові да яго Каміліі Марцінкевіч, якая ўтрымліваецца ў астрозе, вядомая сваім дзёрзкім характарам і адкрыта выказвала свае рэвалюцыйныя ідэі. Пастанавілі: для падтрымання далейшай перапіскі, якая можа выкрыць некаторыя акалічнасці, загадаць Скараходаву перадаць хустачку Станкевічу».

На пачатку 1990-х Генадзь Кісялёў прынёс да нас у выдавецтва «Мастацкая літаратура» дзве важкія тэчкі, на якіх было напісана: «Кастусь Каліноўскі» — яго публікацыі, лісты, дакументы паўстання, сведчанні сучаснікаў. Я развязаў тасёмкі і прачытаў эпіграф.

— Каго любіш?
— Люблю Беларусь.
— Так узаемна!

Пароль паўстанцаў 1863 года.

Ды неўзабаве над краінаю падзьмулі іншыя вятры. Мая рэдакцыя была разагнаная, і загадам палкоўніка, што быў кінуты кіраваць нашым міністэрствам (на тым свеце палкоўнікі Лосеў і Шалгуноў разам з Мураўёвым задаволена пацёрлі рукі), я ў кампаніі аднадумцаў быў звольнены з выдавецтва «за выпуск исторической и другой сомнительной литературы». На вялікае шчасце, тыя дзве тэчкі не загінулі і ў 1999-м папоўнілі «Беларускі кнігазбор» зялёным томам «Кастусь Каліноўскі. За нашую вольнасць». Тут у чарговы раз на ўсю поўніцу выявіўся геній Кісялёва — архівіста, гісторыка і публіцыста, які рашуча бараніў імя нацыянальнага героя ад спробаў паставіць яго подзвіг пад сумнеў.

Ужо ў новым стагоддзі мне выпала інтэлектуальная раскоша супрацоўнічаць з Генадзем Кісялёвым у часе падрыхтоўкі першага выдання «Імёнаў Свабоды». Можна сказаць, што дзясяткі яе старонак, азораных імёнамі паўстанцаў 1863-га, былі напісаныя з блаславення мэтра. Ён падказаў, дзе знайсці выявы Камілы Марцінкевіч і Ахіла Банольдзі або за скрухаю, але абсалютна ўпэўнена параіў спыніць пошукі партрэта юнага Адама Пуслоўскага, які ўдзельнічаў у паўстанні адзін дзень і ўсё роўна загадам Мураўёва-вешальніка быў пакараны смерцю...

У мяне ўваччу і цяпер стаіць спадар Генадзь — у калідорчыку, вузкім ад кніжных шафаў, што не змяшчаюцца ў пакоях, схуднелы, з прабачлівай усмешкаю, уласцівай хвораму чалавеку, які ўжо прадчувае блізкасць сыходу.

Падпісаць яму «Імёны» я яшчэ паспеў...

А праз пяць гадоў мне выпаў гонар пісаць прадмову да ўжо не першай пасмяротнай кнігі спадара Генадзя «Смак Беларушчыны», куды ўвайшлі шмат якія дасюль незнаёмыя чытачу тэксты. Ужо самі іх назвы прымушалі душу заходзіцца ў радасным прадчуванні — і проста захапляльнага чытва, і глыбіні, і заўсёды неабходнай для маўклівай размовы з Генадзем Кісялёвым разумовай працы: «Пра вешчых песняроў, фартуну Радзівілаў і сакрэты старых радаводаў», «У Дабраўлянах, прыстанку музаў, у 1863 годзе», «Беларускія вёрсты шатландскага дваряніна Сен-Клера»... Аматараў гісторыі чакалі сапраўдныя сенсацыі.

Цяпер ён сам навекі далучыўся да сваіх сейбітаў вечнага. Да тых, хто стаяў ля вытокаў нацыянальнай ідэі, хто натхняўся ёю, хто вучыў беларусаў жыць у нацыянальных каардынатах — каб здзейсніцца. Хто ведаў адказ на пытанне, якое і ў XXI стагоддзі не страціла вострай надзённасці: «Каго любіш?»

Апошні дуэлянт: Уладзімір Дамашэвіч

Аўтары ўсяго толькі пішуць кнігі, робяць іх — рэдактары.

У нас мноства помнікаў пісьменнікам і ніводнага — рэдактару. Калі будзе нарэшце прынятая пастанова пра выпраўленне гэтай несправядлівасці, я прапаную зрабіць правобразам бронзавага Рэдактара незабыўнага Уладзімера Дамашэвіча.

Часам здаецца, што ён быў рэдактарам ледзь не ўсёй сучаснай беларускай літаратуры, прынамсі, той, якая чытаецца й перачытваецца — пачынаючы ад Быкава, Караткевіча, Адамчыка...

Мне выпаў шчаслівы білет: рэдактарам маіх першых опусаў стаў Дамашэвіч. Працаваць з ім было не проста лёгка, але, я сказаў бы, светла. І гэтую светлыню аніяк не азмрочваў той факт, што Уладзімер Максімавіч заўсёды бязлітасна, як пустазелле, выполваў з маіх тэкстаў выраз «так бы мовіць».

Адрозна ад большасці сваіх тагачасных калегаў, Дамашэвіч ніколі не браў на сябе цэнзарскіх паўнамоцтваў. Ён да апошняга змагаўся з галоўным рэдактарам «Маладосці» за тое, каб у маёй першай аповесці «І вярталіся мы...» гарадскіх калядоўшчыкаў-«нацыяналістаў» разганяла й затрымлівала ўсё ж міліцыя, як у аўтара, а не народныя дружыннікі, як загадваў галоўрэд. А потым разам з аўтарам радаваўся, што хоць у эстонскім перакладзе ў тэкст вярнуліся сапраўдныя «героі».

Ён ведаў смак гэтай радасці, бо як пісьменнік сам не раз рабіўся ахвяраю цэнзарскіх нажніцаў, а дакладней — сякеры, што высякала ўжо не абзацы або старонкі, а цэлыя выпакутаваныя кнігі. Дастаткова згадаць мужныя раман Дамашэвіча «Камень з гары», які не мог дакаіцца да чытача цэлыя два дзесяцігоддзі.

Праз розніцу гадоў і досведаў я не меў магчымасці зрабіцца ягоным сябрам, але ўдзячны лёсу, што Максімавіч, як ён дазваляў сябе называць яшчэ з «маладосцеўскіх» часоў, заўсёды трымаў мяне ў полі сваёй цёплай увагі ды ветлівай цікавасці.

Сёння, пасля таго, як ён заснуў астатнім сном, імгненна засвяціліся ў памяці тры гісторыі, без якіх уявіць Дамашэвіча мне абсалютна немагчыма.

Першую можна з гістарычнай падкладкаю назваць — «Клецкая бітва».

Гадоў пятнаццаць таму мы з зусім дамашнім Дамашэвічам ды ягонай жонкаю Галінай сядзелі за сталом у іхнім клецкім доме — дыхтоўнай шляхецкай камяніцы напалеонаўскіх часоў, дзе жылі продкі гаспадыні, бацька якой на пачатку 1920-х працаваў дырэктарам Клецкай беларускай гімназіі. Уразілі не столькі сама дамоўка і старасвецкая мэбля, як схаваныя пад будынкам велізарныя сутарэнні, у якіх, адразу падумалася, маглі б адбывацца самыя неверагодныя падзеі з удзелам інфернальных істотаў. Як неўзабаве выявілася, яны там і віравалі, што вымагала ад уладальнікаў дома немалой адвагі.

Аднаго разу пры гасцях і застоліцы спадарыня Галіна выправілася ў спадчыннае падзямелле па мачоныя яблыкі. Падымаецца па каменных сходах назад у хату, а дарогу ёй раптам заступае велізарны пацук. Мужная ліцьвінка, не выпускаючы місы з рук, уступае з нахабаю ў бойку, каб давесці, хто ў гэтых сценах сапраўдныя гаспадары. І тут на дапамогу свайму каралю з усіх куткоў кідаюцца дзясяткі верных падданых. Следам за Галінаю яны ўрываюцца ў дом, ускокваюць на канапы й крэслы, караскаюцца па абрусу на стол... Уся застоліца ў жаху кідаецца да дзвярэй. Але на шляху хвастатых захопнікаў устае ўзброены кавалак качаргой Уладзімер Дамашэвіч. Менавіта за ім, як калісьці за князем Міхалам Глінскім у Клецкай бітве з татарамі, і застаецца перамога.



Другая гісторыя, у якой таксама можна ўбачыць след пацукоў, адно што іншага кшталту, прычынілася напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 года.

Уладзімер Максімавіч пазваніў (слова «патэлефанаваў» я не ўжываю свядома, бо Дамашэвіч-рэдактар гэты дзеяслоў звычайна правіў як занадта доўгі) з прапановаю тэрмінова сустрэцца. Ён чакаў мяне каля Мастацкай акадэміі. «Валодзя, — сказаў Максімавіч, калі мы зайшлі ў двор, — у бліжэйшы тыдзень, калі ласка, не начуйце дома. Будуць браць. Звесткі з дакладных крыніц. Усюды ёсць нашы людзі». Я згадаў «Клецкую бітву» і сказаў, што буду адбівацца. Дамашэвіч не падтрымаў майго легкаважнага тону і на развітанне паказаў спіс людзей, якіх ён яшчэ павінен быў папярэдзіць.

Трэба сказаць, што я не паслухаўся і начаваў дома. Праз колькі дзён узялі падчас разгрому намётавага мястэчка на плошчы Каліноўскага нашага сына Багдана. Браць дома пачалі праз чатыры гады — у снежні 2010-га. Аднак, упэўнены, што Максімавіч і той, хто перадаў яму спіс, не жартавалі. Проста гады былі запушчаны іншы сцэнар.

Трэцяя гісторыя — пра Дамашэвіча-дуэлянта.

Як вядома, у 1980-я гады дый раней на пісьменніцкіх з’ездах і сходах Уладзімер Дамашэвіч востра выступаў супроць русіфікацыі. А яшчэ — быў час — ён ваяваў з сакратаром Саюза пісьменнікаў Іванам Чыгрынавым. Той паводле пасады адказваў за працу з літаратурнай зменай. Дамашэвіч некалькі разоў публічна прапаноўваў Чыгрынаву зняць з выдавецкіх планаў шматлікія ўласныя выданні й перавыданні на карысць першых кніг маладых пісьменнікаў. Урэшце з гэтай нагоды Уладзімер Максімавіч выклікаў Івана Гаўрылавіча на дуэль.

Усё, здаецца, скончылася прыкладна так, як гісторыя з выклікам на двубой, пасланым у гады Інфлянцкай вайны вялікім князем і каралём Сцяпанам Батурам Івану Жахліваму. Або як гісторыя з такім самым выклікам, што маскоўскі ваявода Шуйскі ў часе аблогі Пскова нашымі войскамі атрымаў ад кароннага гетмана Яна Замойскага, калі, парушыўшы слова, масковец на прызначанае месца не з'явіўся.

Але як бы там ні было, Уладзімер Дамашэвіч, апрача ўсяго іншага, застаўся ў гісторыі і як апошні дуэлянт беларускай літаратуры.

Прыяцель Скарыны, які марыў пра даведнік «БНР»: Алесь Петрашкевіч

На самым пачатку 1990-х нас пазнаёміў акадэмік Дзмітрый Ліхачоў, якога тады называлі «сумленнем расійскай інтэлігенцыі». Была вечарына ў менскім Доме літаратара, на якой я, не зрабіўшы, вядома, ніякага адкрыцця, сказаў, што і самыя сумленныя і дэмакратычныя «старэйшыя браты», калі заходзіць гаворка пра беларускую або ўкраінскую незалежнасць, імгненна мяняюцца. У пацвярджанне згадаў некалькі выказванняў Ліхачова. Напрыклад, пра тое, што «не радея о единстве Русской земли, полоцкий князь Всеслав провел свою жизнь в беспутных походах».

Пасля вечарыны мяне спыніў высокі і высакалобы чалавек з уважлівым позіркам. «Намеснік галоўнага рэдактара «Беларускай Энцыклапедыі» Алесь Петрашкевіч, — адрэкамендаваўся ён. — Пра Ліхачова — цалкам згодны...»

Выдавецтва тады яшчэ называлася «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя». Мне спадабалася, што новы знаёмы прапусціў другое слова.

Я не схільны ідэалізаваць яго. У свой час ён працаваў у апараце ЦК КПБ, пісаў п'есы «у духу патрабаванняў партыі», да прыкладу, пазмагаўся сваім пяром з рэлігіяй. Але Петрашкевіч, па-першае, заўсёды заставаўся беларусам, а па-другое, яго найперш вабіла не апаратная дзейнасць, а гісторыя і навуковая праца, чым ён і заняўся, калі сышоў у «Энцыклапедыю».

Ён пісаў сцэнары мастацкіх фільмаў, апавяданні, памфлеты, лібрэта, але найбольш цікавае і вартае стварыў у жанры гістарычнай драматургіі. Петрашкевіч прызнаваўся, што хоча адлюстраваць у сваіх п'есах увесь шлях беларускага народу — ад часоў Рагвалода да нашых дзён.

Літаратуразнаўцы адзначаюць, што драматургіі Петрашкевіча ўласцівыя канцэптуальнасць, вострая інтрыга, дакладнасць моўнай характарыстыкі вобразаў, публіцыстычная страснасць. Згаданыя якасці найперш выявіліся ў прысвечанай Францішку Скарыну дылогіі «Напісанае застанецца» і «Прарок для Айчыны».

У першай п'есе разам з гуманістам-першадрукаром дзейнымі асобамі сталі Мікола Гусоўскі, Пятро Мсціславец, Максім Грэк, Марцін Лютар, Мікалай Капернік, што стварае пераканаўчы кантэкст еўрапейскага Рэнесансу, аванпостам якога была Беларусь. Часам на сцэне хацелася ўбачыць і самога аўтара, што ў спісе дзейных асобаў мог быць пазначаны як прыяцель Скарыны.

Другі твор, як вынікае ўжо з ягонае назвы, ставіць вечнае пытанне лёсу прарока ў сваёй Айчыне. Скарына апынаецца ў пазыковай пастцы, трапляе ў познанскую турму і ўрэшце пакідае радзіму. Сюжэт, аналогіі з якім няцяжка знайсці і ў сучаснасці.

...Нязменна застаючыся і навукоўцам, Алесь Петрашкевіч пакінуў нам сваю няздзейсненую мару: выдаць энцыклапедычны даведнік «Беларуская Народная Рэспубліка».

Хто здзейсніць гэтую задуму?

Самотны рыцар: Кастусь Тарасаў

На пачатку XXI стагоддзя Кастусь Тарасаў атрымаў унікальны пашпарт. Старонку, дзе ставілася адзнака аб прапісцы, аздабляла адно назва краіны. Больш нічога: ні вуліцы, ні нумароў дома і кватэры. Про-ста — Рэспубліка Беларусь.

Прычыну такой анамаліі можна, вядома, лічыць чыста бюракратычнай. Але мне бачыцца тут рука вышэйшых сілаў. Тарасаў сапраўды быў (і застаецца) прапісаны не ў нейкім канкрэтным месцы і годзе, а ва ўсёй Беларусі. Дакладней — у беларускай гісторыі.

Аднойчы мы, яшчэ незнаёмыя, павінны былі спаткацца ў маім Полацку. Каб не размінуцца, прызначылі сустрэчу каля помніка Скарыну. Спадара Кастуся я пазнаў адразу. Ён выглядаў абсалютна нетутэйшым. Падазраю, што такім самым Тарасаў мог падацца і бронзаваму першадрукару.



Я, аўтар першага і пакуль адзінага гістарычнага апавядання, паціснуў руку мэтру, з-пад пяра якога ўжо выйшаў раман пра Грунвальд. Але для мяне Тарасаў найперш быў аўтарам кнігі эсэ «Памяць пра легенды»...

«Памяць пра легенды» ў маім кнігазборы ўладкавалася поруч з «Зямлёй пад белымі крыламі» Караткевіча. Як быццам дзве кнігі, асцярожна прабіраючыся паміж іншых тамоў, імкнуліся сустрэцца і пасумовіцца. А можа, хацелі, каб гаспадар паклаў іх на вагі свайго не астылага за дзесяцігоддзі захаплення?

Шалі вагаў пахісталіся, але хутка зноў набылі раўнавагу.

Караткевіч і Тарасаў не канкуруюць, а — дзякуючы розным ракурсам і розным метадам мастацкага даследавання гісторыі — цудоўна дапаўняюць адзін аднаго, прычым гаворка не толькі пра дзве згаданыя кнігі эсэ, а пра іх творчасць увогуле.

Першы — вандроўнік, які глядзіць на мінулае, праплываючы над ім на мангальф'еры. Другі — падарожнік, які ступае па зямлі і можа ахапіць вокам меншы абсяг, затое здольны зблізку пачуць і распазнаць патаемныя шолахі, рухі, прыкметы.

Калі гісторыя, згодна з французскім рамантыкам Жулем Мішле, гэта ўваскрашэнне, то Караткевіч уваскрашаў атмасферу і каларыт даўніны, а Тарасаў — рэальных гістарычных асобаў.

Ён ведаў, што гісторыя — не толькі перамогі і ўзлёты чалавечага духу, але — ці не часцей — горкія паразы, рэнегацтва, чорныя здрады з падзеннем у пекла без ніякага спадзявання на прыпынак у чыстцы. Ён, магчыма, як ніхто іншы адчуваў (і прадчуваў!) трагізм беларускай гісторыі, дзе краіна зноў і зноў апынаецца перад мяжой, за якой — нацыянальнае небыццё.

Аднак Тарасаў не быў бесстаронnім сузіральнікам-фаталістам і ніколі не зачыняўся ў кабінеце. Ён не раз пакідаў пісьмовы стол, каб — заўсёды рэзка і доказна — выступіць на мітынгу. Ён не адзін год захоплена й зацята працаваў у часопісе «Спадчына», быў намеснікам галоўнага рэдактара незалежных газетаў «Навіны» і «Наша Свабода». Пазней стаўся адным з заснавальнікаў газеты «Новы час».

Мы не зрабіліся сябрамі, бо гэтага не дазваляла розніца ў гадах, у жыццёвым досведзе, у характарах, але я заўсёды ганарыўся магчымасцю папрасіць спадара Кастуся стаць першым чытачом майго новага тэксту. Штораз гэта ўяўляла сабой складаны экзамен: Тарасаў бездакорна адчуваў любую эпоху, мог умомант злавіць фальшывую ноту і непраўдзівую дэталь...

На мяжы стагоддзяў, ужо ў новым палітычным клімаце, Кастусь Тарасаў выдаў аповесць «Апошняе каханне Міндоўга», якая ўяўляецца мне найлепшым у нашай гістарычнай літаратуры творам пра дачыненні ўлады і ўлады.

Часам здавалася, што для жыцця спадару Кастусю дастаткова адно чытацкай увагі і любові. У тыя гады ён жыў надзвычай сціпла. Наймаў кватэру, а, здаралася, наогул начаваў у майстэрні сябра — мастака і літаратара Вячаслава Дубінкі.

А потым грымнула бяда. Пасля інсульту Тарасаву адняло мову. Нават простым рэчам давялося вучыцца нанова. На шчасце, розум застаўся светлым. Яшчэ не асвоіўшы вуснае мовы, ён зноў пачаў пісаць. Часопіс «Дзеяслоў» прысудзіў яму прэмію «Залаты апостраф». Уразіла сваім экзістэнцыялізмам аповесць «На вайне» пра крывавы патоп сярэдзіны XVII стагоддзя.

Увесну 2010 года Беларускі ПЭН-цэнтр вырашыў ушанаваць Тарасава прэміяй імя Францішка Багушэвіча. За колькі дзён я патэлефанаваў, каб паведаміць навіну лаўрэату. Памятаючы, што прамаўляць сказы яму цяжка, я не разлічваў шмат пачуць з таго боку. І раптам — як гром з яснага неба — Тарасаў адказаў мне выразна і чыста, свежым, быццам толькі што народжаным голасам. Я віншаваў яго ўжо не столькі з прэміяй, як з вяртаннем мовы.

Тая наша размова была апошняй. Праз два дні Тарасава знайшлі нежывым на найманай ім кватэры.

З надмагільнага помніка глядзіць такі самы, як і некалі даўно, у Полацку, чалавек з адбіткам нетутэйшасці на твары.

Гэты самотны рыцар і цяпер у падарожжы — у мінулых ці ў будучых стагоддзях.

Там, дзе мы некалі сустрэнемся.

Кала Бруньён нашага часу: Яўген Будзінас

Калі я задаў сабе пытанне, каго з літаратурных персанажаў нагадвае мне Яўген, адказ выплыў адразу — раланаўскага Кала Бруньёна. На гэтае параўнанне спрацавала нават прысвячэнне рамана святому Марціну, які «сам віно п'е, а ваду на плаціну пры млыне лье».

Яўген, праўда, анічым не нагадваў святога. Хіба што сваёй фантастычнай стваральнай энергіяй, якая дазваляла яму здзяйсняць справы, падобныя да дзівосаў.

Нам вельмі пашанцавала, што сын літоўскага камуніста, колішняга рэвалюцыйнага камісара Жамойці, пагойсаўшы па савецкай імперыі ад Масквы да Цюмені, прыбіўся ўрэшце да беларускага берагу, пачаў працаваць у журналістыцы і стаў адным з вядучых айчынных публіцыстаў.

Пры канцы 1980-х Яўген быў сярод тых, хто не толькі чуйна лавіў вецер пераменаў, але і сам дзьмуў у ветразі нашага карабля на шляху да незалежнасці. Мы і ўбачыліся ўпершыню ў тыя гістарычныя дні, калі ў Чырвоным касцёле адбыўся ўстаноўчы сход «Мартыралогу Беларусі», дзе былі створаны аргкамітэт БНФ, і дзясяткі тысяч беларусаў неўзабаве прыйшлі на Дзяды 1988-га...

Новыя часы дазволілі Будзільніку, як яго клікалі сябры, «зазвінець» на поўную сілу. «Будзі нас, Будзінас!» — напісаў яму тады ў вершаванцы на дзень нараджэння Рыгор Барадулін.

Не пакідаючы літаратуры і публіцыстыкі (шмат хто ўзгадае, да прыкладу, раман «Дураки»), ён стаў старшынём праўлення фірмы-выдавецтва «Паліфакт», якое здзейсніла запатрабаваны на ўсёй постсавецкай прасторы праект «Итоги века» — выпусціла цэлую бібліятэку важкіх буйнафарматных тамоў з вершамі, казкамі, дэтэктывамі, самвыдатам XX стагоддзя...

Ён меў безліч клопатаў, але ўлюбёным ягоным дзіцём стаў музейны комплекс старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогіяў «Дудуткі» каля вёскі Дудзічы Пухавіцкага раёна. Яны, паводле непахіснага пераканання Будзінаса , былі якраз тымі Дудуткамі з «Слова пра паход Ігаравы», дзе ў свой час адзначыўся ўдачлівы супернік самога язычніцкага бога сонца Хорса полацкі князь Усяслаў Чарадзей.

У 1994-м дзякуючы Яўгену і ягоным аднадумцам Дудуткі пачалі новае жыццё. Там задыхаў кавальскі горан, закруціліся ганчарныя колы, загрукацелі ткацкія варштаты, пацягнула дымком ад бровара...

На ладжаных Яўгенам шматлюдных святах з іхняй непаўторнай куражнай атмасфераю вакол славутага тамтэйшага самагоннага агрэгата ўперамешку раіліся, нібы пчолы, дыпламаты і літаратары, журналісты і музыкі. І я там быў, і шчасліва адпачываў пад кустом агрэсту, калі пасля шклянечкі «будзінасаўкі» галасы рабіліся цішэйшымі, фарбы — ярчэйшымі, а жанчыны — прыгажэйшымі...

Уяўлялася, што Будзінаса любілі ўсе — былыя жонкі, не былыя дзеці і унукі, Генадзь Бураўкін, Барыс Забораў і Андрэй Вазнясенскі, дзеці і ўнукі сяброў, якім уражанняў ад Дудутак хапала на цэлы год.

Аднак знайшліся і тыя, каму Яўген, ягоныя таленты, вальнадумства, поспех, яго афарызм, што «палітыка — гэта задворкі розуму», сталі ўсё больш замінаць...

Надышоў дзень, калі ён не змог прыехаць у Дудуткі як гаспадар.

...На самым схіле жыцця, безнадзейна хворы на рак, Будзінас напісаў і паспеў выдаць кнігу пра каханне «Давайце, девочки». У пакінутым мне аўтографе ён у сваім стылі выказваў веру ў тое, што мы іх усіх (меліся на ўвазе зусім не дзяўчаткі) перапішам, пераплюнем, перакрычым... далей ішла экспрэсіўная нецэнзурная лексіка.

Гэтыя ўсе ў апошні момант (ужо і арэнда была аплочаная) подла сарвалі прэзентацыю «Девочек» у мінскім Доме літаратара, які ўжо належаў не літаратарам, а тым, каму чытаць кнігі «нету ўрэмені». Але Яўген усё роўна прэзентаваў кнігу — у Дудутках, каля свайго загараднага дома, куды і запрасіў усіх, хто сабраўся перад зачыненымі дзвярыма ў сталіцы.

Хвароба ўжо пахіствала яго, але здавалася, ён проста рухаецца ў такт мелодыі вядомай саксафаністкі. На шчодрых сталах былі ягоныя ўлюбёныя беларускія і літоўскія прысмакі. За сталамі — тыя, каго ён не хацеў пераплюнуць і перапісаць.

Гэта было развітанне.

Наступны раз мы сустрэліся там, калі ў садзе, зусім блізка ад дома, які так любіў Яўген, з'явіўся надмагільны камень.

Уладзімер Арлоў

Розныя простыя рэчы

Франц СІЎКО

Дабрыня — як патрыятызм: і дурною можа быць, і кваснаю, і, наадварот, высокаю, годнаю. Вось старая маці спаларушанага, ды збольшага ўжо паднятага лекарамі на ногі 40-гадовага сына ў цягніку дадому з санаторыя вязе. Анёлахоўнік, іначай не скажаш — гэтулькі датклівае, ледзь заўважнае староннюю воку самаахвярнасці ў кожным жэсце жанчыны. Адзінае, што дарэшты выдае стан душы — водбліск трывогі ў вачах, калі памагае даросламу дзіцяці ўсторкнуць на ногі тапкі, праводзіць паглядам у калідор, а потым чакае, наструніўшыся ўсім целам, калі ж яно ўрэшце вернецца з прыбіральні ў купэ.

Такое ўражанне бывае пасля сустрэч са знаёмымі ў горадзе, быццам я адзіны тут, у гэтым амаль паўмільённым Віцебску, шчаслівы чалавек. Усім кепска, усе пры сустрэчы скардзяцца, на штосьці ці кагосьці наракаюць. Тое самае па тэлефоне: жальбы, жальбы, жальбы... Матор аўто не цягне, ныркі хібяць, яешня прыгарэла, піва занадта горкае, цешча (свякрова) зноў свінню падклала і г.д.

Крыху падсалоджваюць карціну масавай роспачы самадзейныя паэты. Жаліцца, жаліцца чалавек, а напрыканцы і агаломшыць знячэўку тым, дзеля чаго, відаць, і патэлефанаваў: «А давайце вам вершы пачытаю! Хочаце?»

Ну што за пытанне! Канечне ж — «хочаце», асабліва калі заспелі цябе спрасоння ці калі з ванны на званок выскачыў і стаіш басаног мокры на халоднай падлозе са слухаўкаю ў намыленай руцэ.

А іншым разам слухаеш, слухаеш жальбы ды, збіты дазвання з панталыку патокам словаў на тым канцы проваду, чакаеш: ну калі ж? калі?

Доўгі, як дарога да святасці, маналог пра беды-няшчасці, уздых, усхліп, хвіліна маўчання, і вось яно, нарэшце, доўгачаканае-жаданае, галоўнае — накonт вершыка: «А хочаце..?»

Як знячэўны ўдар пад дых — купка маміных півоняў наўзбоч зарослага быльнягом ды вербалоззем папялішча. Наўкола хмыз, трава ў рост чалавека, бязлюддзе, і раптам — такое. І горыч, і радасць, і здранцвенне. І ўсё-такі радасці куды больш. Як прывітанне з іншасвету, як доўгачаканая вестка пасля трох дзесяцігоддзяў маўчання.

Не так тое цікава, як цяжка было чалавеку ў сітуацыі прыніжанасці, як тое, што сталася прычынаю метамарфозы, калі ён, крыху ўзняўшыся над іншымі, сам пачаў іншых прыніжаць. Як тыя, што з затурканых выбіліся, самі іншых туркаць пачынаюць? Вось тут, мабыць, вартая пяра псіхалогія і пачынаецца.

Памятаю, вёў курсы для супрацоўнікаў тэхналагічнага ўніверсітэта, большасць з якіх складалі бібліятэкары. Пераважна жанчыны ўсё справаводства ў бібліятэцы на мову, а потым прыйшла з ідэалагічнага аддзела нейкая пстрычка і ціха сказала: «Па-беларуску ў вас усё? А навошта?». І гэтага было дастаткова, каб напрацаванае ўадначас скасаваць. Цікава, колькіх дэцыбелаў голасу спатрэбіцца наглядчыкам ад ідэалогіі, каб сённяшні рух вакол мовы зачыніць? Ці і шэпту будзе даволі?

Журналіст з дзяржвыдання: «Ну, і калі ўжо вы, пісьменнікі, пачнеце да справы беларусізацыі прычыняцца?». — «А што ты на ўвазе маеш? Прыйсці да вас у рэдакцыйны калектыў за мову агітаваць? А працэс хіба нельга зрабіць? Збярыце калектыў, аб'явіце беларускую асноўнай рабочай — і справа ў капелюшы».

Звычайнае айчыннае нахлебніцтва: грошы за працу атрымліваць буду я, а выконваць працу — ты, калі ласка, парупся.

Даводзілася назіраць у студэнцкіх групах: часам лепш за ўсіх валодаюць беларускаю мовай самыя кандовыя, самыя непрымірымыя беларусафобы. І ўсё адно гэта — яшчэ не паказчык узроўню самасвядомасці маладога чалавека. Жыццё наперадзе, і як яно павернецца, якім бокам — хто ведае.

Калісьці ўдваіх са старшынёй гарадской суполкі ТБМ напрасіліся да тадышняга мэра Віцебска наконт пашырэння сферы ўжытку ў горадзе беларускай мовы пагаварыць. Сустрэў такі імпазантны, хітраваты чалавечак, ківаў у адказ на нашы ветлівыя закіды, быццам пагаджаўся з тым, што яму казалі, а на твары чыталася няўцямна-непрабівальнае: «Што вам трэба, дзяцюкі? Які бес вас круціць з гэтаю вашаю мовай?» Бачна было: іншае зусім, толькі не мова, у галаве ў чалавека, іншае яму абыходзіць. А праз колькі месяцаў і вылезла вонкі таемнае: злодзей аказаўся наш гарадскі галава, пракраўся на нечым, пасадзілі. І цяпер ужо нам, двум дурням, няўцям стала: навошта хадзілі? І галоўнае — да каго?

Вушмала. Так кажуць пра дзіця, якое быццам бы ўжо збольшага і разумее, што яму кажуць, і разам з тым яшчэ — не зусім. Недарослае, але ўжо разумнае.

Я ў сваe шэсцьдзясят з гакам таксама, аказваецца, вушмала. «Вы стары, але разумны стары», — быў днямі ашчаслівілены фразаю знаёмага студэнта-земляка.

Землякі-міжрэчанцы дзівіліся: «У горадзе жывеш, а ніколі ад цябе рускага слова не чулі. Няўжо не навучыўся па-гарадскому дэчыць?» А я на той час якраз у школе рускую ўжо ці не дзясяты год выкладаў. Але што праўда, з вяскоўцамі ні разу сабе размаўляць не па-іхняму (не па-нашаму) не дазволіў. І не з ідэі нейкай ці ўпёртасці. Проста вылучацца з роднага асяроддзя лічыў за негустоўнае. Яны па-беларуску, я па-руску — яка нясветная мешаніна была б пры размове, які дысананс.

У гарадской ратушы падзея: прэзентацыя выдадзенага нашым творчым Саюзам літаратурнага альманаха. Людзей аж зашмат, а журналістаў з дзяржвыданняў — каб хоць адзін дзеля разводу. І зразумець іх можна: напішаш, а рэдактар не ўхваліць, не пусціць у друк на падставе, што Саюз жа, маўляў, «не той», апазіцыйны. У рэдактара дзеці, на паборы з людзей падчас падпісной кампаніі гадаваныя, унукі, што з голаду, мабыць, пухнуць і сваёй чаргі на дабрачыннасць памяркоўных гараджанаў чакаюць. Там, глядзіш, праўнукі з'явяцца — іх трэба будзе ўсім народам, талакою падымаць. У простыя ж карэспандэнты рэдактару ісці, дарма што год пяць ужо, калі не болей, паводле ўзросту пенсіянер, зусім не хочацца. Так і працуем грамадою на тых згаладнелых начальніцкіх нашчадкаў.

Ва ўсёй гэтай гісторыі са змушэннем літаратараў да пераходу ў праўладны Саюз — быдляцтва і нічога болей. Прыходзіць нейкая сволач і пачынае вучыць людзей, дзе і з кім ім быць. Кожны, каму ўзбрыдзе ў галаў, нясе ў творчую сферу паводле вызначэння неўласцівыя ёй правілы гульні. Дасядзіць чалавек да пенсіі ў нейкай канторы, а затым гоп — у тыя ж літаратары. Статус быццам памяняе, а ўсё, што спадарожнічае яму, прыняць ні жадання, ні волі, ні — галоўнае — звычкі не мае. І пры чым тут была б псіхалогія? Тая, корпацца ў якой — тое самае, што шукаць чалавечнасці ў алігатара або, як казала Како Шанэль, дбаць пра космас замест таго, каб пастарацца забяспечыць усіх больш-менш прыстойнымі прыбіральнямі.

З усіх святых дваіх асабіста ведаю. Ірыну і Рысіка, сястру і мужыка яе. Дваццаць сем гадоў штодня з лыжкаю пры спаларушаным, нерухомым дзіцяці — хіба не годна чыну святасці? І ўсё — моўчкі, без нараканняў, крыўдаў на несправядлівасць лёсу.

У вёсцы, што ў вярстах чатырох ад Віцебска, могілкі на ўскрайку, упрытык да апошняй хаты. Вузенькая, метры ў чатыры, паласа паміж сцяной жытла і агароджаю кладоў, і адразу ж за ёю — захаванні, крыжы, пастаменты. Уявіць толькі: у хаце гаспадар на ложку, побач, амаль што ўстыч, парэшткі нябожчыкаў у трунах. Якія нервы трэба мець, каб з дня ў дзень, з году ў год вытрымліваць гэткае суседства. Ды яшчэ ў дадатак да ўсяго спажываць з гародчыка ў ежу садавіну-гародніну. А ці яшчэ лепш: панесці тую гародніну на кірмаш, прапанаваць людзям на добрае здароўе ўсё тое амаль што на могілках вырашчанае.

Як паглядзіш каторыя айчынныя інтэрнэт-форумы, дык часам такое ўражанне складваецца, быццам адны 80-гадовыя старыя на іх пішуць-дыскутуюць. І не ва ўбостве афармлення думак справа. Штосьці іншае, кшталту кашы ў галаве, з шэрагу светапогляднага, дакладней — адсутнасці яго, мабыць. У сукупнасці ж з бязграматнасцю і наогул уражанне канца свету.

Ноўкаўскі лес — зусім прыгарадны, вярстах у шасці ад Віцебска. Між тым месцамі глухі да вусцішы: яры, яміны, гушчар. Асабліва ў бязлюднае будзённае ранне страхавіты. І грыбны, як ні дзіўна. Асабліва там, дзе дзікамі акупаваны-разрваны. На разворах тых заўсёды што-небудзь ды знойдзеш. Не баравік, дык так званы польскі грыб падымеш, не падасінавік, дык сушонік. Груздоў шмат, парасонаў. Паходзіш па вепручных сцежках, і няўзнак кошык з сяго-таго і набярэцца. І ўдала, і не самотна: хто-ніхто, хоць якая, хоць вепручыная, але ж жывая душа побач. А сёлета — каб след жывёліны у лесе. Выбілі ўадначас дзічыну з-за пагрозы эпідэміі чумы, і адразу спусцеў неяк, зрабіўся няўтульным, нежывым прыгожы ноўкаўскі лес.

Па звальненні з універсітэта, падчас працы прыбіральшчыкам пры храме дзве рэчы асабліва прыгняталі: грэблівае стаўленне людзей да фізічнае працы і, адпаведна, праявы высакамер'я да чалавека, што ёю займаецца. Але найбольш — непрыкрытае часам дэманстраванне переваг перад такім чалавекам. І з боку тых жа святароў, Божых служкаў, між іншым, таксама. Што асабліва прыкра.

Як бы проста ні выглядаў часам Чэхаў, асоба яго на фоне нават такіх няпростых дзеячаў рускай літаратуры, як, напрыклад, Дастаеўскі, — самая няпростая, загадкавая. У такой аграмаднай перапісцы не дае майстар кароткага апавядання зачэпкі для пранікнення ў глыбінныя пласты душы. Пра тое, што елі ўранні, напіша, пра ўласны гемарой — калі ласка. А што за ўсім тым — аднаму толькі Богу ды самому аўтару ведама. Такое ўражанне, што староннія — усе, а душа — заўжды па-за кантэкстам прамоўленага.

Ці быў Чэхаў чалавекам апалітычным, асацыяльным, як яму гэта закідаюць (і часта не без змыслу ўласную адсутнасць грамадзянскай пазіцыі апраўдаць), лёгка праверыць. Напішам твор пра высокага чыноўніка па імені Равуноў-Каравулаў або Прышыбееў, дадамо, што быў ён «старэнькі і заржавелы» і занясем у якое-небудзь нашае сённяшняе дзяржаўнае выданне. Ці надрукуюць?

Быццам апалітычны, быццам асацыяльны, а з усяго пакалення расійскіх літаратараў мяжы стагоддзяў — выкрывальнікаў сацыяльных заганаў таго часу — не выпадае. Хіба што Салтыкову-Шчадрыну крыху ў імпэце выкрывальніцтва саступіць. Чэхаў не шукаў праўды, ён яе ведаў, ілюстраваў бязжаласна і разам з тым па-мастакоўску адстаронена, і гэта больш за ўсё людзей і збівае з панталыку.

На фоне шчыраванняў вядоўцаў расійскіх тэлеканалаў на тэму ўкраінскіх падзей штоpазу іншыя расіяне ўзгадваюцца. Талстой з яго «Хаджы Муратам» ды прасякнутым спачуваннем да ўдзельніка вызвольнай барацьбы 1863 года творам «За што?». Антон Паўлавіч з яго нымі добразычлівымі згадкамі пра сялянаў-украінцаў з ваколіцаў Славянска ў лістах да сястры па дарозе ў Таганрог. І хоць і няшмат такога ўзгадаеш, ды ўсё ж хоць на які градус не такою змрочнай выдае сітуацыя з братамі-расіянамі.

А самая наша "Вайна і мір", галоўны літаратурны здабытак, — канечне, «Тутэйшыя». Тут галоўнае: і гісторыя, і метафізіка, і псіхалогія, і калектыўнае бессвядомае, і тэатр абсурду. Люстэрка, у адбітку якога ўсё астатняе, нават самае выбітнае — усяго толькі варыяцыі, фрагменты мазаікі. Нязручная, мулкая, дакладная ў сваёй непрывабнасці ілюстрацыя адсутнасці, дурнога пафасу ад наяўнасці таго, чым хваліцца ніяк не выпадае. Было б іначай — вунь бы як ахвотна сёння на цытаты расцягвалі.

Экспромты каля Каложы

Данута БІЧЭЛЬ

Дасвеццем

Твая сівая Каложа
не дапаможа,
нас ніякіх няма даўно ўжо...
Сама я на бездарожжах
не назбірала нікчэмных грошай,
не памятаю, як там прыгожа...
Гародня без агарожы...
Між зор-гарошын
размінемся, агню нап'емся
ці сцюжы –
незаўважныя душы...
Час ліхтары патушыць...

З маленства

Ад страху ўцякала я ў кроны дрэваў...
Цяпер шукаю гаючай вады.
Гаіла душу мне сястрыца Рэня.
Цяпер мяне слухаеш толькі Ты.

Бывае, з Табой уначы размаўляю,
з Кісуляй муркочам малітвы ў цямне.
Выпрошваю тым, хто любіў мяне, раю.
І чую: Ты, Божанька, чуеш мяне.

Раслі ў бядноце з Табой таксама,
бабкі пяклі з залатога пяску...
Калыску маю калыхала мама,
Тваю — Маці Божая на святым абразку...

Але не ўсюды

Адбываюцца цуды,
але не ўсюды.
Дапамажы мне, святы Антоні,
выплыць на чыстыя тоні!

Пабылі мы ў Гародні ў гасцях,
як пакупаліся ў сажы.
Скакалі па нечых касцях.
Нехта паскача па нашых.

З каменя ў камень сцяжыны
ўцякаюць ад летняга грому.
Гэтыя чужыя машыны
адвозяць душы дадому.

З віру ў вір віравалі,
заблудзіліся ў глеі...
Назбіралі... Падаравалі...
Болей анічога не ўмелі.

Нават вораг не памятае,
якая была я не тая...
Адчыняць акно ў Беларусі,
а я не прачнуся...

У цішы

Цішы дрыготкія хвалі
дрыжалі, паветра ўдыхалі,
на выспе нябёс нічыёй
чужую душу прызямлялі.

Застануся на выспе
незабранай зямлі нічыёй,
ціша ніколі не выспее,
наталюся яе гаманой.

Словы шукаю –
знаходжу вечнасці знакі, –
Бога дыханне, укрытае
у Табэрнакулюм.

У Дрэве Жыцця Сына Божага,
ў вечнасці нішы
цёплым дыханнем узношуся,
раствараюся ў цішы...

Шчэ адчуваю навобмацак
быту грэшнага цвердзь.
Шчэ прысяду на воблачках...
Шчэ не ведаю, што гэта ўжо смерць...

З маладосці

Дачка Адама з Гародні
маршчынкі хавала пад маску,
адчыняла акенца ў казку...
На дрывотні...
І Нёман — праз пералазку.

Ад Каложы да той хаціны
па камені ветрык каціўся.

На клёнах Каложы птаства
спраўляла бязладныя хоры,
нават ты, невылечна хворы,
крыху папраўляў гуморы...

На Каложы
сама Маці Божая
шліфавала з маёлікі пліткі,
укладала каляровыя крыжыкі
паміж плінфамі...

Ты варыў чарадзейную каву,
ў турку з Нёмана чэрпаў ваду...

Божа!
Так нерэальна прыгожую,
так празаічна цікавую
казку... Ты нам прыдумаў!

Світанак

Світанак
пасля бязладных начных выпіванак –
на хмарках шкельцы ад шклянак,
з паблытаных нітак-маланак...
За плотам зялёным ганак...
Месячык з-за фіранак...
Францішак?
Антонік?
Янак?
Так...
Клёны пайшлі за Адамаўнай
ва ўсясветнае бездарожжа...
ад Маці Божай з Каложы.
Нёман руйнуе бераг –
трашчыць Каложа.
Толькі сонейка
тое самае.
Знак.

Студзень 2015 г.

Бяссонныя дрэвы

Іна СНАРСКАЯ

Памяці нябеснай сотні

Па беламу — трава,
па чорнаму — няволя.
Галосіць удава
савою ў чыстым полі.
Па чорнаму — снягі
пярыну сцеляць душам,
дзе волаты ляглі,
там і сірот задушаць.
А пушчы хараство
спяліць птушыны выраі.
Лятучае яство
успомніць сны пра крылы.
Успомніць даўніх дзён
жывую таямніцу:
хто ў вышыні анёл,
той на зямлі — крыніца.
А прашчур скажа нам:
«Не будзі яко чэрві...»
І херувім, як храм,
асвяціць шлях вячэрні.

Воўк снягоў

Што не заб'е, то зробіць нас мацнейшымі.
І выйдзе воўк снягоў хадой адважнай.
Ён, князь лясоў, ступіў на след мой першы,
ён ведае, чаго свабода важыць.
І я ваўку зірнула прама ў вочы.
Пабачыла паходні і капканы,
І зоркі спелыя сярод сірочай ночы,
і кінуты ў звера чорны камень.
Што не заб'е, то зробіць нас мацнейшымі.
Мы па адной цяпер ішлі сцяжыне.
Душу сваю я ратавала вершамі,
а воўк снягоў застыў кустом ажыны.

***

Дзе неба з аўчыну,
там ў сэрцы — айчына.
Сірочае шчасце
у людзях не прапасці,
выжыць, не знікнуць,
да здрады не звыкнуць.
А вецер — салёны.
А позірк — калёны.
І жоўтыя вёрсты —
няродныя сёстры.

***

Не паспяваю жыць
не для сябе, для іншых,
і дарагіх людзей
губляю па чарзе.
Гарадзь мае лясы —
душу ўкрывае іней.
Гарыць мая зямля —
скляпенне сноў-надзей.
Не паспяваю жыць —
за хлебам, не за срэбрам.
І некалі сустрэць
сваіх сівых сяброў.
Ляціць, ляціць жыццё
да брамы ў лютым небе.
І не хапае сіл,
і не хапае слоў...

Мы — дрэвы, бяссонныя дрэвы.
Далей і далей ад зямлі
ляцім пад замовы мяцеліцы,
пад міты шаўковай травы.
Мы — дрэвы. Пішуце лісты нам
на крыльцах сівых матылькоў,
на павуцінках асенніх,
на лапах галодных ваўкоў.
Далей і далей ад карэння...
Жадаем, як волі, нябёс,
ды цяжка нам стаць на калені,
прыняць адзінокі наш лёс.
І горка, і позна вярнуцца
галінкам на небе вякоў,
і не дае азірнуцца
кара са слядамі цвікоў.

***

Знямелі вершы, песні адзвінелі,
змялела рэчка вербамі на ўсход,
а я іду да прадвечнай веры
у адмысловы сонечны паход.
А я іду — і дрэвы вырастаюць,
і матылькі садзяцца на руку,
а гэта значыць, што мяне пазнаюць
на тым баку.
Адтуляцца нябёсы — брама ў сэрца,
на могілках загояцца крыжы.
Там, дзе любоў — няма тугі і смерці.
Хіба дажджы...

***

Нябыту кажа дарога: «Не!»,
«Не!» — забродам і выраканцам.
Мой лёс запрагае лепшых коней,
на Радзіму збірацца раніцай.
А Радзіма кожнаму сілы дае
аб каменне не біць калені.
Дарога вучыла мяне сталець
памяццю пакаленняў.
А на могілках родных крывавяць крыжы.
Жаўрукам акрыляць далягляды.
Дарога-сястрыца дадому бяжыць,
да бацькаўскага пасаду.
Нябыту кажа дарога: «Не!».
А я прарастаю галінамі
ад каранёў, што жывілі мяне
і на зямлі пакінулі.

***

Мы сустрэнемся ўсе калі-небудзь
на скрыжалях вятроў і дарог,
у далонях сунічнага неба,
на зары каралёў і нябог.
За ракой, за абшарам сусвету
чарадзейныя ёсць астравы,
там і вечар рыфмуецца з верай,
там і сосны — сёстры травы.
Мы сустрэнемся ўсе нечакана
па крыві, па сумленню радня...
І рукі не падыме Каін,
і прыме яго зямля.

Жаўруковая воля

Памяці загінулых

1
Дзяўчынка, вяшчунка, душа,
ты моўчкі крычыш ад болю.
Толькі табе вырашаць,
ці прадаецца воля.
За сотню, ці за пятак,
за маселка з пірагамі.
Бо каінава пячаць –
штандарам чужым над намі.

2
Цёмна, сястрыца, цёмна
у светлы жнівеньскі дзень.
На камяністай прошчы
я запалю агмень.
І паляцяць, як знічкі,
золатам да нябёс
душы ахвяраў прошчаных
у жаўруковы лёс.

3
А яны больш лістоў не напішуць,
бо паляцелі лісты
пялёсткамі сонных вішань,
водарам кветак лясных.
А яны лістоў не напішуць.
Надта павольна хада
дрэваў, што бачылі іх яшчэ
жывымі. Пакуль бяда
не разлучыла.
Заснулі. Спачылі.

4
А лёс схавае пад крыло
апошнюю зару.
Усе дарогі замяло,
а я агнём гару.
Цяпер за кожнага дажыць
прыйдзецца ўдвая
табе і мне на той мяжы,
дзе вечная трава.
На той адчаянай мяжы
пастрэленых вятроў,
дзе нават горкія крыжы
спяшаюцца дамоў.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 3 (103) | 27 сакавіка 2015 | № 12 (429) Новы Час

Згублены ключ

Сяржук СЫС

Аднойчы я нетаропка крочыў старымі кварталамі паўднёвага, амаль курортнага, палескага горада. У той вераснёўскі ціхі надвячорак я нічога не заўважаў вакол сябе: ні засяроджаных гараджанаў, якія спяшаліся пасля працы схавацца за сценамі ўласных ракавак-кватэр, ні адвольна падзеленых светлафорамі табуноў імклівых аўтамабіляў, ні тое, што пад нагамі гучна хрумсцелі апалыя рудыя лісты.

На душы было ніякавата, а, мусіць, нават і горш — пагана. Тым вечарам я неяк выразна адчуў, што мне катастрафічна не хапае грошай. Дальбог, пярэчу сам сабе, а калі іх увогуле хапае? Ды і не толькі мне. Але тут... тут іншае. Перад табой — утульная вуліца, віруе жыццё, а ў цябе ў кішэні — анічога. Добра, што яшчэ засталіся цыгарэты, інакш быў бы зусім кірдык.

Я ішоў, напружваючы памяць прыгожай вуліцай, што плаўна збягала ўніз, да ракі. Недзе тут, паблізу, мусіла месціцца невялічкая майстэрня. Звычайна ў такіх можна адрамантаваць парасон, заправіць газам запальнічку. Мне ж патрэбна было тэрмінова вырабіць ключ. Дакладней — два. Звычайныя «англійскія» ключы ад звычайнай савецкай «хрушчоўкі». Недарэчна так атрымалася, што амаль адначасна ключы пагубляліся — спачатку дачка «пасеяла» свой, а назаўтра згубіла ключ і жонка. Трэці і апошні быў пры мне: ляжаў глыбака ў кішэні джынсаў.

Майстэрня, заціснутая з абодвух бакоў стракатымі камерцыйнымі павільёнамі, аказалася зусім побач з тралейбусным прыпынкам. Вусаты дзяцюк прасунуў палову няголенага твару ў металічную амбразуру і, зірнуўшы на прагнутую далонь з ключом, запэўніў: «Зраблю. Такія нарыхтоўкі якраз падвезлі. Толькі якіх пяць хвілін пачакай. І рыхтуй дванаццаць тысяч».

Раніцай, перад тым, як выправіцца на працу, жонка дала дваццатку. На два ключы не хапала, але калі замовіць хаця б адзін — застанецца восем тысяч рэшты. Не вагаючыся, я пагадзіўся.

Новы ключ-блізнятка быў яшчэ цёплы ад напільніка майстра, калі я ўкруціў яго на металёвае колца і глыбей засунуў у кішэню. Затым няспешна палез у барсетку па цыгарэты «LM», закурыў. Жонка звычайна вяртаецца дадому а сёмай, а цяпер — гадзіннік звыкла слізгануў па запясцю — толькі пяць. Часу заставалася яшчэ ладнага, і можна нетаропка прайсціся пешшу.

Калі быць, наколькі гэта магчыма, шчырым, то я не магу адказаць нават сабе, чаму ўзгадваю той звычайны дзень гэтак падрабязна. Якая прычына? Ці патрэбныя каму гэтыя недарэчныя ўспаміны, гэтая залішняя дэталізацыя шэраговага вечара правінцыйнага саўковага журналіста. Хіба што толькі сабе. Верагодна, было яшчэ тут нешта іншае, адметнае і няўлоўнае, і таму, відаць, спрацаваў механізм перасцярогі: не забыць, не згубіць у мітусніне падзеяў дробныя дэталі таго вечара.

Вялае сонца даўно кульнулася за няроўную сцяну дыхтоўных мураваных дамоў. Але ліхтароў яшчэ не запалілі. Вуліца, яшчэ больш прыгожая і загадкавая, паволі ахутвалася сінявата вераснёўскай дымкаю, якая няўлоўна пачала раз'ядаць строгія абрысы рэчаў. Раптам я звярнуў увагу на нешта знаёмае: у натоўпе мільганула стракатае паліто, — рэдкая з'ява для нашага горада. Раскрыўваючы лёгкае мроіва, паліто імкліва перасякала вуліцу. Яно таксама заўважыла мяне і, шырока раскінуўшы рукавы, заварочвала ў мой бок. Так яно і ёсць: Барбароса.

— О, Жорж! Якая сустрэча! Няўжо, нарэшце, мы пабачыліся? — ягоная нардычная ўсмешка, падалося, асвяціла на момант наваколле.

Прызнацца, у той дзень мне не хацелася бачыць нікога са знаёмых, але што, урэшце, залежыць ад нашага жадання?

— Прывітанне! Куды спяшаемся? Табе ж, здаецца, у адваротным накірунку, — азваўся я, трапляючы ў абдымкі даўняга сябрука.

— Вяртаюся на працу. Хутка павінны пад'ехаць знаёмыя лабусы па тэксты. Публіка жадае спяваць маімі словамі, разумееш? Грэх, браце, адмовіць. Ну а ты? Як жыццё, нацыяналіст? Чакай... месяцы два не бачыліся, відаць? — без перадыху, нібы ў радыёэфіры, сыпаў словамі, як заўсёды, цупкі і чырвонашчокі Барбароса.

— А што тут казаць? Усё як і раней. Жыццё, кажаш... Што за жыццё! Так, звыклая бытавуха, тлум. Ты ж сам бачыш, колькі часу прайшло ад нашай апошняй сустрэчы. Ды і сустрэліся во, на бягу, выпадкова. Смешна казаць — жывем жа амаль побач. А каб вось знайшлася вольная гадзінка, дык маглі б па-ранейшаму, па-людску, правесці час.

— Хіба паўгадзінкі, не болей. Можна крыху прайсціся, — і дадаў асцярожненька, нібы правяраючы маю рэакцыю: — Можа, дзе піва на вочы патрапіць.

Верыце, піць мне не хацелася. Тым больш піва. Устыла, мякка кажучы. Аднак, зрабіў выгляд, што якраз гэтага і чакаў, моцна ж хацелася «паспавядацца» пра свой, надта ж незразумелы і трывожны, настрой перад сябруком. Барбароса перакінуў пашарпаную, са штучнай скуры, сумку з пляча на плячо, і мы шпарка перайшлі на другі бок вуліцы, дзе магчымасцяў «піўнуць» было значна больш.

Амаль усе твае рухі пад татальным кантролем. І ты думаеш, мне гэта не абрыдла? Начальству што? Тыдзень — у Балгарыі, тыдзень у Германіі. Затым у сталіцу, за прачуханцам, затым — разборкі і накачкі на месцы...

У бліжэйшым гастраноме таннага піва не было. Скончылася яно і ў піўным шапіку, які нахабна вытыркаўся з-за вугла яшчэ, мусіць, даваеннага гмаха.

— Слухай, Жорж, тут непадалёк закусачная, памятаеш? Можа, лепей гарэлкі возьмем па чарцы, — сябар яўна рушыў напралом. — Толькі вось што ў нас з фінансамі?

— Тысяч восем усяго... — сціпленька і неяк вінавата вымавіў я.

— Ну, я сёння нашмат багацейшы, — канчаткова ламаючы маё крохкае супраціўленне, усклікнуў Барбароса.

У чырванаватым паўзмроку закусачнай хісталіся-таньчылі мужчынскія сілуэты, глуха плёскалася бязладная гамонка. Тут было вільготна, цёпла і кісла. Бармэнша прыязна прывіталася з Барбаросам. «Цікава, — разглядваючы закускі за шклом вітрыны, заўважыў я пра сябе, — і калі гэта ён паспеў стаць тут сваім?»

Узялі па сто пяцьдзясят «Белай Русі» ды па бутэрброду з вэнджанінай. Чыстая стойка была адна, каля ўваходу. Да яе і прымацаваліся.

— Дарэчы, якім бокам ты сюды завітаў са свайго Зарэчча, — ставячы напалову асушаны кілішак, пацікавіўся Барбароса.

На момант зморшчыўшыся ад выпітай гарэлкі, я дастаў з кішэні ключы.

— Бачыш, ключ рабіў ад кватэры. Ключ, браток, на тое і ключ, каб аднойчы згубіцца. І тым самым даць магчымасць, напрыклад, сустрэцца старым сябрукам. Інакш — калі б яшчэ пабачыліся. Ты ж як заўсёды — з галавою ў сваім эфіры: «Доброе утро, дорогие радиослушатели!»

Я ведаў, што Барбароса недзе ў сярэдзіне леташняга красавіка нарэшце ўладкаваўся на сталую працу. Увогуле, такі расклад мне падабаўся. З аднаго боку. А з іншага... Знікла магчымасць для сумесных тусякоў. Праўда, інтэрпрэтацыя гэтай падзеі з ягоных вуснаў прагучала крыху інакш.

— Ведаеш, я даўно шукаў творчае працы. І вось... паабяцалі спачатку і самастойнасць, і свабоду, але якая ў фірмачоў творчасць, хутчэй «творчаства». Спусташальны канвеер, пры якім сябе ўсведамляеш нейкім робатам, ды і ініцыятывы аніякай не праявіш. Амаль усе твае рухі пад татальным кантролем. І ты думаеш, мне гэта не абрыдла? Начальству што? Тыдзень — у Балгарыі, тыдзень у Германіі. Затым у сталіцу, за прачуханцам, затым — разборкі і накачкі на месцы... Але, даруй, нешта мяне не ў той бок панесла. Па-сутнасці, гэта для нас не мае аніякага значэння, бо мы з табой жывем, як той казаў, «тут і цяпер». І гэта галоўнае... Во, ледзьве не забыўся, — разліваючы пароўну гарэлачныя рэшткі, працягваў Барбароса. — Уяўляеш, сустрэў неяк на праспекце знаёмага, ну, тыпу музыканта. Ну дык ён, між іншым, прызнаўся, што намерваецца стварыць песню-гімн пра Гомель. «Музыка ўжо ёсць, штогадзінна гучыць на Палацавай вежы, што ў парку, засталося напісаць толькі тэкст». Даваўся чэлу распавесці пра верш Канстанцыі Буйло, на які і напісалі тую музыку. Ён жа ад пачутага нават падвяў.

Гарэлка тым часам скончылася, так і не наталіўшы, не сагрэўшы нутро. Выйшлі вонкі на прыступкі, прыцененыя шырокім рознакаляровым навесам, хапнулі поўныя лёгкія ледзь ядранага, бадзёрага пасля кіслай духаты закусачнай паветра. Я выцягнуў з пачка апошнюю цыгарэту.

— Няблага для пачатку, — бесцырымонна, ажно да хрусту ў костках, пацягнуўся Барбароса, — толькі, ведаеш, нешта яшчэ мацней захацелася піва, і з гэтым ніяк не суладаць.

Цяпер ужо я імгненна падтрымаў ідэю сябра, бо смага і сапраўды станавілася нясцерпнаю.

Півас чакаў нас амаль што побач, у нядаўна адрэстаўраваным падвальчыку за вуглом. Раней тут месцілася «апорка», у якой гадоў некалькі назад азвярэлыя мянты паламалі мне дзве рабрыны. Карацей, да майго незразумелага настрою прычапіліся яшчэ й тыя «настальгічныя» ўспаміны.

Выбар спынілі на «Рэчыцкім». Я не баюся, калі нехта пачне аспрэчваць, што «Рэчыцкае» піва з маёй, амаль роднай Рэчыцы, — верх асалоды. Я магу сцвярджаць гэта настолькі ўпэўнена, наколькі ўпэўнены ў тым, што, скажам, пасля гэтай восені абавязкова надыдзе зіма. Шкада, што «Рэчыцкае» цяпер вараць зусім у іншым месцы — на Бабруйскім бровары.

Падлічылі дробязь. Грошай заставалася і на піва, і на цыгарэты абодвум. Вяртацца ў закусачную расхацелася. Заставаўся адзіны, правераны шматкроць варыянт: густы і амаль бязлюдны цяпер сквер, што на працягу амаль цэлага квартала прымыкаў да вуліцы-красуні, ад якой мы і завярнулі сюды. Адшукалі лавачку паміж вялізных дрымучых таполяў, расселіся надоўга і грунтоўна. Барбароса

тварам да тратуара, я — спінай да яго. Звычка. Каб не лахануцца і не загрымець у чорны варанок за распіццё алкаголю ў грамадскім месцы.

Зусім побач, з-за рознакаляровай і яшчэ не апалай лістоты цьмяна вытыркалася бронзавая калода бюста вялікага земляка.

Парушаючы стромкую цішыню, па тратуарнай плітцы звонка пракаціліся два металічныя коркі.

— Дык вось, — адпіўшы з бутэлькі на чвэрць, сказаў Барбароса, — спяшацца ўжо няма куды, і таму пачнем з вершаў. Слухай, браце, амаль свежачок, учорашні.

Чамусьці паэзія з піўным «гарнірам» мяне ніколі не вабіла, хаця паасобку і першае, і другое ўяўляе значную каштоўнасць. Дык жа не перапыніш паэта, пакрыўдзіш. А ён вунь, чытае, забыўшыся пра сустрэчу з музыкамі, як і я, дарэчы, пра тое, што ў жонкі няма ключоў ад кватэры.

— Ну і як табе? — хітраватая ўсмешка на твары Барбаросы чакала неадкладнага адказу.

— Нешта надта брутальнае, — пацягваючы піва, неяк глыбокадумна азваўся я. Асабліва моцнае вось гэта... Я паўтарыў тое, што запомнілася — фінал верша:

Всё дальше от тепла,
от естества истоков...
И хочется рожать
в реальную среду.
Не в среду, не в четверг,
а в безвременье сроков,
Пока усталый мозг не перегнил
в бреду...

Мне асабліва хваліцца не было чым, таму змог адказаць хіба што просценькім экспромтам, кшталту гэтага:

Апошняе піва сезона
У брудным сырым павільёне
Такое ж цягуча-стылае,
Як сум непраходны мой.

— Жорж, што за настрой, ты смярдзіш песімізмам! Такія опусы нават у тваёй сранай газеце не надрукуюць, — Барбароса выбухнуў раптам грунтоўным маналогам, спыніць які, што перайсці пешшу праз Чорнае мора. — Эх, Жоржык, як хутка час пралятае! Пясок жыцця сочыцца няспынна і няўмольна. Трэба рабіць нешта важнае. Глянь вакол, колькі харошых людзей, колькі цікавых спраў. А мы... і пасярод недзе, у гушчыні, як кажуць, і ўсё адно ў нейкім глухім вакууме. Мы нібыта манекены за вітрынай... нават горш. Яны хоць вопратку рэкламуюць, а нам увесь час даводзіцца прымерваць да сябе чужыя паводзіны, правілы, думкі, урэшце рэшт. А насамрэч — трэба жыць напоўніцу, толькі тут і цяпер. Іншага не можа быць.

З глыбіні скверу нечакана прысунулася, шоргаючы сухім лісцем, пажылая жанчына ў пакамечаным даўгім плашчы.

— Дай Бог вам здароўечка, сыночкі! Ці не аддасце пустыя бутэлькі? — дыпламатычна звярнулася да нас старая.

Я добра ведаў Барбаросу, таму маўчаў, з цікаўнасцю чакаючы далейшага разгортвання падзей.

— Ды вы што? Нас нельга турбаваць ні ў якім разе. Прашу, не перашкаджайце. Тут вырашаецца важнае дзяржаўнае пытанне... Якое ёсць таямніца. Праходзьце міма, не парушайце кармы вечара. Мы падумаем пра вас, толькі пазней, пасля... пасля...

Уздыхнуўшы ўголас і яшчэ больш прыгнуўшыся, яна адышла на дзесятак метраў назад, у цемру, спынілася за дрэвамі.

— Слухай, а як там Класік маецца? — прыпыняючы няёмкую паўзу, запытаўся я.

— Захрас трывала ў хаце, нікуды не вытыркаецца, хіба што зрэдку півасу выпаўзе пахлябаць пры наяўнасці капусты. Сустракаліся днямі, дык ён за старое: «Усё, блін, дзяцінства скончылася. Бяруся за справу».

Калі вам раптам даводзілася чытаць кнігу «Гамбургскі рахунак», толькі не Бахарэвіча, а расійскага пісьменніка Віктара Шклоўскага, тады вы можаце ўзгадаць, як там пра класікаў напісана: «Класікамі людзі, звычайна, становяцца не адразу. А тут здараецца, жыве сярод нас чалавек. Ідзе, скажам, куды-небудзь, а мы, разам усе, гаворым: «Вось ідзе Класік»».

У нашым горадзе таксама жыве Класік, і ён лічыць нас з Барбаросам сваімі сябрамі. І таксама псуе паперу геніяльнымі творамі.

Аднак дастойна завяршыць свой маналог Барбароса не паспеў: размову перапыніў моцны шум. Пад разлапістай ліпай гучна сварыліся тры пажылыя кабеціны. Сярод іх і нашая нядаўняя знаёмая ў даўгім плашчы. Яе голас дамінаваў над астатнімі.

— Ды вы толькі гляньце на гэтую прайдзісветку, — крычала яна, нібыта звяртаючыся да ўяўнай публікі. — Апошні сорам згубіла. І кватэру мае, і вопратка цёплая ёсць, а ёй усё мала. Але тут ты не разгавеешся. Давай, каціся прэч адсюль!

Збольшага, усё было зразумела. На чужой тэрыторыі пад сховаю цемры аб'явілася непажаданая канкурэнтка, вось яе і выжываюць тутэйшыя абарыгенкі.

Я спехам дапіў піва.

— Хопіць назіраць за боем быкоў! Давай вяршыць лёс. Трэба, каб і пустыя бутэлькі прыносілі людзям карысць. Ці ёсць якая прапанова?

Барбароса ажывіўся зноў:

— Паколькі прынцып сацыяльнай справядлівасці грамадства адпрэчылі канчаткова і беспаваротна, бутэлькі проста так дзяліць не будзем. Ды і як падзеліш, калі іх дзве, а бабулек трое. Таму прапаную абвясціць аўкцыён.

Давялося перапыняць слоўную траскатню сябра сваім варыянтам.

— А што, калі пляснуць іх аб тратуар, проста так, на вачах у гэтых прагных цярпельцаў?

— Ну, Жорж, прымітыўна гэта, мы ж не вандалы...

Тым часам падзеі пад ліпай разгортваліся натуральна і хутка прыйшлі да лагічнага завяршэння: пасаромленая канкурэнтка, брудна лаючыся, шыбавала да прыпынку. Парадак на тэрыторыі пратэктарату быў адноўлены, а нашыя бутэлькі трапілі па прызначэнні. Мы неяк нават расчараваліся хуткім завяршэннем лакальнага інцыдэнту.

— Вось яна, проза жыцця, — расчулена вымавіў я і дадаў, уздыхнуўшы: — Праўда, менавіта з гэтага эпізоду прозы якраз і не атрымаецца: ні дынамікі, ні сюжэту. Ні вастрыні...

— Ну не кажы, — з паўабароту завёўся Барбароса, — навелы часта вось так і растуць, нечакана, на голым месцы. Прыгадай Бёля, Борхеса. Або таго ж Акутагаву. Усё да простага рэалістычна, і вось гэта — кла-сі-ка. Мы ж, лічы, перажылі сапраўдную буру пачуццяў. Ледзь-ледзь крутнуць сюжэцец — і шэдэўр гатовы...

— Але тады гэты эпізод перастане быць праўдай. Праўда, яна й была вось тут, 5 хвілінаў назад, а што застанецца ў памяці?.. Звычайны суб'ектыўны ўспамін з ладнымі дамешкамі нашага цынізму і эгаізму. Дадай яшчэ, што адны і тыя ж падзеі бачацца намі зусім па-рознаму. Годзе перайначваць, яшчэ адзін Класік адшукаўся!

— Чакай-чакай, зараз праверым... А ну, паслухай, як бы такі аповед гучаў, калі б пра гэта раптам напісаў я. Напрыклад, назавем навелу так: «Лісты апускаюцца восенню».

«У прынцыпе, мне похер, каторай з іх дастанецца мая пустая бутэлька: той, што ў чырвонай хустцы, ці той, што ў паліналым балоневым плашчы. Адзінае, што мне не падабаецца, гэта іхняе рэальнае таптанне перада мной — з нагі на нагу, з пяткі на насок. А сама толькі й думае, напэўна: «Калі ж ты дап'еш гэтае кіслае пойла, гад?» і глядзіць пры гэтым проста табе ў рот. Што застаецца рабіць? Думаць пра яе цяжкае жыццё: пенсію не плоцяць, кватэра дарагая, сын-халасцяк усё прапівае...

А ў галаве быццам выюць сакавіцкія каты перад працуючым трансфарматарам. Гуд такі, што зусім не да вершаў. Што я ў іх разбяру, на лаўцы з бутэлькай піва, тым больш, калі бабуленцы прагна глядзіць у рот. Гэта мы з табой, Жоржык, прыселі півка выпіць, патрындзець пра тое-сёе, паглядзець на буянне красак восеньскага парка. А бабулям напляваць на наш з табой лірычны настрой. Адшукаліся інтэлігенты! Крута было б, калі яны з-за дзвюх пустых бутэлек тут бойку ўчынілі. Вышэйшы клас! Не-а, пакуль стаяць, чакаюць. Тая, што ў хустцы, прама перад намі, а тая, што ў плашчы, крыху правей, але настроена больш рашуча...

— Ты што, хочаш гэтыя вершы ў газету аддаць? Яны там каму-небудзь патрэбныя? Іх увогуле хто-небудзь тут чытае: газеты, вершы? Пісаць дык, напэўна, пішуць. Кожны ж хоць бы раз у жыцці спрабаваў. Асабліва ў часы смаркатага юнацтва. Душа гуляе. Пасядзіш вось так гадзіны дзве ў гарадскім парку. Можна і без піва. Лірыка аж з вушэй прэ: «Унылая пора, очей очарованье... И бабки две пустых бутылок ждут...» Эх, Жорык, шкада, што ў мяне «капуста» толькі заўтра з'явіцца, а то б яшчэ па адной узялі.

— Маладыя людзі, вы ўжо дапілі?... Вы калі дап'яце, аддайце бутэлечкі вось гэтай жанчыне. У яе ногі хворыя. Яна тут зраніцы ходзіць. А той не давайце. Яна і пенсію атрымлівае, і сын у яе на заробкі ездзіць у Маскву...

Гэта што яшчэ за пудзіла? Заступніца. Тры багатыры. Ты хутчэй выпіў, табе ў рот не глядзяць. Вось яно, выпрабаванне сытасцю. Ты б хоць не кпіў тут.

Увогуле, лагічней было б пры такім раскладзе шахнуць гэтую бутэльку аб асфальт. Як прамое завяршэнне нашага базару. Сам жа казаў — рыць тут нехер. Трэба звальваць у сталіцу, у Расію, на Захад. Хоць куды, абы не грузнуць у гэтым ліпкім месіве мястачковасці. Ты хочаш сказаць, што раней, пры камуністах, такіх бабулек не было? Падаянне так вось, оптам, не прасілі? Дык пры камуністах і шанцаў на нармальнае жыццё не было. Усё чырвона-шэрае. А цяпер табе — па поўнай праграме, на выбар — ад бляклa-мышынага да ядавітага ультрамарына. Свабода, яна ж таксама на два канцы. Вяршкоў без карэньчыкаў, на жаль, не бывае. І мы з табой не дзеля таго на гэтую лаўку селі, каб бой быкоў назіраць. Не бачыліся даўно, а піва — як нагода. Хіба не так? Вершы, яны, мажа, і пішуцца недзе, ды ўсё неяк не тыя. Геданізм плюс камп'ютарызацыя ўсёй краіны. Вось у палітыку я лезці не хачу. Хачу толькі, каб бабулі не замінaлі мне піва піць на лаўцы і не прыгнялі б сваёй лаянкай лёгкае патрэскванне сухога лісця. Вунь іх колькі насыпала. Хочаш–не хочаш, а задумаешся пра трагічную перадвызначанасць быцця, гледзячы, як яны зрываюцца адкульсьці з-пад неба і марудна, ледзьве пагойдваючыся, апускаюцца да сваіх аджыўшых субратцяў.

— Можна забіраць бутэлечку-та? Дык вы той жанчыне не давайце. Вы гэтай аддайце...

Вось і яны сарваліся са сваіх месцаў у соцыуме і кружаць, кружаць. Такія ж пажоўклыя, як восеньскія лісты. Праз гэта таксама трэба ў жыцці прайсці. Як ты там чытаў толькі што ў перадапошнім вершы, нешта пра голуба, які нерухома застыў у верасні?

Усё. Дапіў. Аддаю... Таму што яна раней падышла, раней улезла ў нашую лірычную сустрэчу.

Чуеш, Жорык, колькі цяпер пустая бутэлька, тысячы тры?..

Ужо добра сцямнела, і вуліца прабівала сабе шлях скрозь цемру стужкаю размытых агнёў. Піва зрабіла тое, што і павінна было зрабіць: мы развіталіся каля грамадскай прыбіральні. Дахаты мне чамусьці зусім не хацелася, і зрабілася раптам шкада, што адзіныя ключы ад кватэры былі толькі ў мяне і вымушалі вярнуцца туды, дзе ля пад'езда нявесела чакае абураная маім спазненнем жонка.

Я мацней сціснуў у кішэні ключы, ірвануў у перапоўнены тралейбус. Пахмурны натоўп шчыльна абхапіў мяне і прыціснуў да задняга вакна. Тралейбус імкліва набіраў хуткасць, і агні горада ператварыліся ў яркія суцэльныя пісягі. Я пільна ўглядаўся ў здаўна знаёмую вуліцу і не пазнаваў яе. Вуліца зрабілася аднастайнай і шэрай. А тое, што я ведаў пра яе прыгажосць раней, здалося звычайным падманам.

Дзверы ў кватэру рыпнулі і без ключа. У прыхожай гарэла святло, на звыклым месцы вісеў жончын плашчык.

— Ты?.. Ты дома, але як?

— Пра што гэта ты? — выглянула з пакоя жонка, — а-а, ты пра ключ. Прабач за няўважлівасць, я знайшла яго ў касметычцы...

Фота А.А.

Тэхніка спальвання страхаў

Анатоль ІВАШЧАНКА

Расколіна

у гэтай прасторы ты кожнаму нешта павінны
тут не разважаючы кідаюць кпіны у спіны
у цеснай задушлівай рубцы падводнае лодкі
бы пранцы, пладзяцца бясконцыя цёркі ды плёткі

тут б'юць па сваіх (ды чужыя баяцца не надта)
тут кожны кіруе уласным нябачным парадам
тут ганіць святое здаўна ёсць
прыкметай эстэта
калі вы эстэт — bardzo prosimy ў нашае гета

тут прынцып спрадвечны: не дзякуючы а насуперак
тут лялька вусатая лічыцца першай красуняю

тут слухаюць дупай, тут лесу з-за дрэваў не бачаць
тут моўныя курсы засноўвае
каця кібальчыч

бязрукія пляскаюць ў ладкі, руіны страляюць
бязрукавы спраўна збіраюць паўнюткія залі

тут радыё рокс вызнае крымінальны шансон
а радыё стыль корміць піпл расейскай папсой

пасля палітэху тут пішуць някепскую прозу
а хлопцы з філфаку адточваюць форму даносу

тут вучаць у педах майстэрству
мастацкага свісту
на мове гамэра тут допыт вядуць кадэбісты

тут хаза з баландай нярэдка мянуецца «дом»
тут перадаецца праз гены стакгольмскі сіндром…

пасля эпікрызу звычайна ідзе эпілог
ды скончым шматкроп'ем зацягнуты свой маналог…

Тэхніка спальвання страху

Ты сядаеш за стол,
не клапоцячыся пра наступствы.
Быццам бы рокенрол
не памёр,
быццам добрая рыфма
апраўдвае ўсе напісаныя тутака глупствы,

быццам бы памяняць падфарціла
абрыдлае гіры на крылы,*
быццам зніклі з экрану
крыклівыя хары ды рылы,

быццам словы знайшліся
і склаліся ў слушны радок.
Быццам Бог напісаў у зваротным
кароткае «ок».

Час раскідваць бутэлькі
і час іх збіраць па дварах.
Час маўчаць і заплюшчваць вочы.
Час нявечыць малюнак
і спальваць чарговы свой страх…

Ты сядай, але помні:
няможна ў адную страфу
трапіць двойчы.

* Гіры — пачуццё абавязку (япон.)

***

Пятыя суткі доўжыцца вайна.
Варта палегла першаю,
паспеўшы пасляць
сігнальны феерверк
рэштаю сняданку
паўз рот і нос.
Штодня вы атрымоўваеце зводкі
з месца ваенных дзеянняў.
Мяркуючы па колькасці лейкацытаў,
што з'явілася ў ранішнім баявым лістку,
апошнія сілы дэмабілізаваныя і кінутыя ў бой.
Моладзь і дзеці…

Учора на вайсковай нарадзе
было вырашана ўвесці цяжкую артылерыю —
трэці антыбіётык.
Пятыя суткі гэтае маленькае схуднелае
цельца змагаецца.
Пятыя суткі ты глядзіш, як яго
ліхаманіць і трасе.
На пятыя суткі, працерашы пыл з абраза,
кладзешся з малітваю.
Каешся ва ўсім здзейсненым і няздзейсненым
(у гэтым жыцці і ў ранейшых).
Абяцаешся выправіцца,
заняцца дабрачыннасцю.
Не заглядацца на тых, хто дзеля гэтага
створаны…

Твайму хлопчыку
10 месяцаў.
І ты просіш у яго даравання
«за тое, што твой тата баязлівец, самалюб і, да ўсяго, казачны дурань, які лічыў квадратныя метры, думаючы, што не зможа камфортна існаваць у гэтым дзіцячым садку…
Сыне, застанься, нам так шмат чаго яшчэ трэба абмеркаваць з табой».

Проста запомні гэта
як мага надаўжэй.

Ранішняя прабежка па фрэндстужцы

Упырснуўшы ў вену навіны
гарачыя, з каваю ўперамешку
(перш як працоўны ты-дзень пачаць),
абавязкова цяпер павінны мы
здзейсніць па стужцы прабежку.

Даведацца, хто нарадзіўся,
хто акаціўся, а ў каго — дзіця,
хто сам здзяцінеў ушчэнт, хто ажаніўся
і ў які сёння бок ракеты ляцяць.

Хто апрануў вышыванку,
а хто яго паспеў залажаць.
Хто піражок сцягнуў, хто склаў танка,
а хто, на танку, едзе мір абвяшчаць.

Лайкнуць — справа абавязковая —
(з карпаратыўнае этыкі)
некалькі вершаў, ясна, іх не чытаючы:
хіба ж чаго накрэмзаць новага
здольныя гэтыя, бляха, паэцікі.
Урэшце, паставіць курсор
на поле «Што ў вас сёння на думцы».
Колькі хвілінаў паўзірацца ў манітор
і напісаць: «Ні чарта, сябры.
Не крыўдуйце»

Кірля

На сыход Ляпісаў

З начы не працуюць вушы.
Усё перасохла да гландаў.
Нямая панылая вусціш.
Радок — за глыток. Без гандлю.

Старыя птушыныя рухі
у рытм не патрапяць новы.
Рыфмы ліпнуць, бы мухі.
Вусны варушаць словы:

«Забудзься, што мы казалі –
памятай, што зрабілі».
Тыя, каго мы кахалі,
станьчаць на нашай магіле.

Навечна захраслы ў горле
куплет без крыві не выйдзе.
Сустрэнуцца бусел чорны
і orzeł biały увысі.

Забудзьцеся — што рабілі.
Памятайце — што казалі
тыя, каго вы любілі
й каму насамрэч спявалі.

GUNS N' ROSES

Падарожжа
*асаблівa на свежыя дрождж*ы
*ды пад ранішні жнівеньскі дождж*ык —
хіба штосьці шчэ можа быць лепш?
Чым далейшым
чым далейшым стаецца замежжа,
то ўсё меней вид тебе залежыць
ды праўдзівейшым робіцца верш.

Кіламетры
усё бліжай і бліжай да мэты
з кожным словам далей ад мяне ты,
хоць насамрэч, насамрэч — бліжэй.
Ў падарожжы
ператворацца ружжы ў ружы,
непітушчы нат стане відушчым,
каб пасля не заплюшчыць вачэй.

Зігзагі спіралі

Серж МІНСКЕВІЧ

***

Ю. Г. і іншым падобнага кону…

Паэты падобныя да птушак
Але толькі іх душы
Здольныя лётаць…

Паэты, як матылі
І розныя мушкі,
Але толькі іх шэпт, трымценне, гудзенне
Вольныя лётаць…

Паэты накшталт рыб,
Якія не марскую глыб,
А зыб
Прасторавай пены
Разрываюць уздымам-падзеннем…

Паэты, нібыта аблокі ці хмары,
Убіраюць рэха зямлі,
Яе мары.
І згусткі іх думак —
І клёк іх —
Ствараюць маланкі…

Паэты — ракеты,
Што лятуць ля заранкі,
Планетай
гуляюць у футбол,
Імкнуцца забіць космасу гол
Прыгожы…

Паэты — Сусветы,
І толькі іх зоркі
На самай высокай ноце
Зрываюцца ў імгненным палёце…

***

Ты — мая фея,
З табой
Я нямею
І нічога зусім не ўмею.

А ты хочаш, каб я
Быў падобны да волата,
Скалы разбіў
І здабыў
Дыяменты
І золата.
А ты хочаш, каб я
Быў чараўніком,
Адным узмахам

Узвёў нялялячны дом…

Аднак, «фея» — твой нік,
А мой — «чараўнік»…

Праўда нік — указальнік жадання…

Кватэрны раманс

Ты — анёл мой самы блізкі!
І навошта кожны вечар
У вялікія валізкі
Ты збіраеш мае рэчы.

Хочаш, стаў мяне да сценкі
Перад чорным аўтаматам —
Позіркам здыму сукенку,
Сценка стане даляглядам.

Падкладзі ў партфель мне бомбу,
Пажадай сустрэцца з чортам —
Я куплю лікёр, а дома,
Бомба зробіцца нам тортам.

Падмяшай у маё піва
Небяспечную атруту —
Гэта будзе стымул дзіўны,
Ложак стане нам батутам!

Сярэдзіна лета

Гэтай ноччу плачуць вербы расою,
І русалкі плывуць паўз бераг ракі
(Маладзейшая ўсхваліць тоні касою.)
І за імі прасочаць юнакі-рыбакі…

Зорны круг крутане сівавусы вядзьмак,
Як сухое галлё, кашляне лесавік,
Дзесь завые воўк ці мо ваўкалак.
А мы проста адзначым яшчэ адзін лік.

Зігзагі спіралі

Неба прашыта
ракетай,
нібыта іголкаю з ніткаю,
І хуткасцю пpыткаю
Імчыць карабель
Першай
населенаю
арбітаю.
…Мільярды гадоў
гатаваў
кухар-сусвет
Жыццёвы булён
для выпечаных добра планет

Каб мог Пакліканец рушыць
На сушу
І потым
скрэсліўшы
крыламі
крыж
уласнага ценю
Узняцца
над зямным
прыцяжэннем…

Серэнада

На цёмным завулку,
Чорныя рукі —
цені,
І самотны ліхтар,
Іх гаспадар,
Нам дорыць
Нашыя
усмешкі…

Дзве мройныя здані —
Мы да світання
Будзем блукаць,
І вецер сузор'яў
Міфічных гісторый
Падорыць нам
тысячы
сюжэтаў…

Анатомія нянавісці

Анатоль САНАЦЕНКА

Яго нянавісць да мяне здзіўляла.

Перш за ўсё — сваёй неабгрунтаванасцю. Падстаў для яе я не даваў — гэта дакладна. Тады — чаму? Чаму не дробнае бытавое раздражненне, якое лёгка можна было б спісаць на што-небудзь нязначнае, а менавіта — паўнакроўнае, усёабдымнае пачуццё. Дзе яго вытокі? Якія матывы?

Калі пачалося гэта вар'яцтва? На памяць прыходзіць толькі млявае сяброўства, позніе вячоркі ў рэдакцыі і ў яго дома, выраз Танінага твару, пры згадванні якой па-ранейшаму, з бязлітаснай пяшчотай, нешта кранае за сэрца...

Яна была аднолькава далёкая ад нас абодвух, маё сіратлівае пачуццё да яе так і засталося неўсыноўленым. Таму яна таксама не магла быць прычынай яго нянавісці. Але скрозь успамін пра яе вернемся ў тыя часы — самы надзейны, самы хуткі шлях у мінулае. Калі ласка, адзін білет...

– Паглядзі на гэта. Ён немагчымы, ці не праўда? — культурненька душачы смех, Таня падсоўвала мне яго малюнкі-шаржы, даволі непрыстойныя, на добра знаёмых нам людзей. — А гэты, як ён табе? — нявінна пыталася яна, высоўваючы на першы план самы нахабны яго накід — відавочнае перайманне яшчэ нераскаянага Бердслею.

Мяне некалькі шакавала гэтая яе нечаканая дзёрзкасць, гэты альпійскі пераход з крайняй выхаванасці ў нізіну непрыстойнасці, што, аднак, не пазбаўляла яе адвечнага зачаравання, не аслабляла моцы яе жаночых чараў.

Відаць, ёй падабалася бянтэжыць мяне, — мяне, які ўжо развітаўся з юнацкім рамантызмам, але захаваў у недатыкальнасці сваю прыродную рафінаванасць.

Я, ненаўмысна грэбліва, двума пальцамі, браў яго малюнкі за краёчак і з нявызначанай (як мне бачыцца) усмешкай адкладваў іх.

Яна вы́клікала мяне. Не, — не на мастацтвазнаўчы дыспут, а на эмацыйную дуэль, бітву, так бы мовіць, гармонаў. І, разумеючы гэта, я заставаўся спакойны і непрыступны, як Напалеон напярэдадні Ватэрлоо.

Таня. Мілая Таня. Калі б ты ведала, якое месца займаеш у маім сэрцы, у маім жыцці, то, несумненна, кінула б усе свае размовы і занялася б добрапарадкаваннем нашых адносін. Але ты, вечна нацэленая да іншых берагоў, дакладней, — да іншага берага, прыкаваная табой жа вырабленым ланцугом да мінулага, шлях якому ў будучыню перагароджаны мігатлівым сапраўдным, ты жыла дарагім табе самападманам, засцерагаючы яго ад дзённага асвятлення.

Доўгі час, як ты і хацела, я карміў цябе ўласнаручна выгадаванымі ілюзіямі. Калі ж мая ілюзорная плантацыя была спустошана нечаканым парывам лёсу і я страціў магчымасць дарыць табе іх, — мы перасталі разумець адзін аднаго. Я хацеў сысці па-ангельску, але, з бясконца чароўнай грацыяй, ты дагнала мяне на лесвічнай пляцоўцы. У тваіх вачах былі неўразуменне і спалох. «Бывай. Бывай. Так будзе лепш для нас абодвух», — у думках кажу я табе. Падымаю каўнер і зябка іду ў шэрыя будні, дзе цябе ўжо няма...

Лёгка, як паплавок, усплывае ў памяці наша знаёмства з ім. Апынуўшыся ў чарговы раз (усё дзеля свабоды!) у статусе вольнага журналіста-найміта, я ў прыемны красавіцкі дзень наведаў рэдакцыю адной з мясцовых газет, дзе мяне ведалі і, здаецца, шанавалі.

Ён быў там — маўклівы, пануры хлопец, з арыйскімі валасамі да плячэй, які меў гопніцкую звычку паліць на кукішках. З-за вострага пяра і кульгавасці ў рэдакцыі пра яго не без іроніі, за вочы, казалі: «Наш Авадзень». («Авадзень» распавядаў усім, што ваяваў у замежным легіёне, удзельнічаў у гераічных бітвах, быў паранены. Насамрэч ашуканы муж не ў час вярнуўся дадому, давялося скакаць з гаўбца. Няўдала.)

З першых жа хвілін знаёмства ён запатрабаваў справаздачы пра мае ўражанні ад яго матэрыялаў, нядаўна надрукаваных у «Губернскіх навінах». Я іх, здаецца, не чытаў ці чытаў няўважліва, і нічым не мог быць карысным для яго жабінага самалюбства.

«Добра, потым раскажаш», — літасціва папярэдзіў «Авадзень» і экспрэсіўна перакінуўся да іншай тэмы.

Іншай тэмай была зацяжная хвароба нашага агульнага знаёмага — журналіста з ласкі божай, які пакутаваў залішнім сяброўствам са спадаром Бахусам.

Хто-небудзь з нас (магчыма, я) прапанаваў наведаць яго, па-таварыску падтрымаць, дапамагчы, калі трэба...

Уладзіміра Іванавіча — так звалі нашага прыяцеля — мы сустрэлі яшчэ на подступах да яго жылля. У кампаніі Бахуса і Марфея ён велічна ляжаў на паркавай лаўцы, і да нашага прыходу над ім паспеў ужо схіліцца адзін з мясцовых анёлаў-ахоўнікаў — міліцыянт. На шчасце, нашы пасведчанні змаглі зрабіць на яго патрэбнае ўражанне, і пасля некаторых роздумаў Уладзімір Іванавіч быў перададзены нам на парукі.

Мы даставілі нашага таленавітага сябра ў яго радавы маёнтак і асабіста пракантралявалі яго адбыццё ў краіну гасціннага Марфея.

Залатыя дзянькі! Усе яшчэ сябруюць адно з адным, і так далёка яшчэ да нянавісці, якая затым вельмі сказіла нас у

ласкавых люстэрках будучых часоў.

Калі мы далучылі Уладзіміра Іванавіча да нашай, незразумелай яму, рэальнасці, ён запрасіў мяне да сябе — паласавацца песнямі яго рок-н-рольнага куміра, да якога, зрэшты, і я быў неабыякавы.

Паслухалі. Папілі гарбаты. Пагаварылі. Мой арыйскі прыяцель расчуліўся настолькі, што стаў запрашаць у свае загадныя ўладанні. «Дзякую, барон, я вымушаны сысці. Заўтра ў мяне будзе цяжкая бітва на беласнежнай раўніне пісчай паперы. Іншым разам, іншым разам».

Іншага разу не было. Нашае прыяцельскае знаёмства ў сяброўства так і не перарасло. Мяне бянтэжыла яго гіпербалічная эмацыйнасць. Яго (відаць) — мая ўраўнаважанасць і снабізм. Напэўна, гэта той выпадак, калі супрацьлегласці не сыходзяцца.

Зрэшты, у тыя часы мы з ім далёка і не разыходзіліся. Не далей адлегласці, якую патрабавалася пераадолець, каб патрапіць з «Вячэрніх навінаў», дзе я працаваў цяпер, у «Губернскія навіны», дзе працаваў цяпер ён. А пасля аб'яднання гэтых выданняў у адзін выдавецкі дом мы нават паспелі папрацаваць разам. І што вы думаеце? Ніякіх сігналаў, ніякіх прарочых сноў ці сімвалічных падзей!

Неўзабаве я сышоў з «Вячэрніх навінаў». Сумна было назіраць, як спадары журналісты, ва ўгоду губернатарскаму густу, добраахвотна абмяжоўваюць сябе ў правах, дадзеных Богам і парламентам. Размовы з рэдактарам, як я і меркаваў, ні да чаго не прывялі, — мне прапанавалі баяцца ўласнага ценю, не чапаць «небяспечных» тэм і г.д. і да т.п. Але замест гэтага я палічыў за лепшае зноў падацца на вольны хлеб. І праз некаторы час выявіў сябе ў якасці спецкара цэнтральнай газеты, дзе свабода слова шанавалася.

Божа мой! Які я быў шчаслівы! Стаўшы паўнапраўным уладальнікам бязмежных угоддзяў часу і прастору, якія распасціраліся цяпер па абодва бакі майго асабістага быцця, я мог крэдытаваць сябе імі бясконца.

Выдатная, райская пара! Словам, спыніся, імгненне. І яно спынілася. Больш за тое — нават пайшло назад, калі мой бедны рамантычны народ прагаласаваў на выбарах за аднаго з тых прайдзісветаў, што ў сне і наяве мараць быць яго, народа, душапрыказчыкамі.

Выбраннік і прыдумаў неўзабаве машыну часу, з дапамогай якой наша краіна апынулася ў далёкім мінулым. З пагалоўным аднадумствам, з любоўю да правіцеля, з забыццём дэмакратычных каштоўнасцяў. З дагістарычнай атрыбутыкай дыктатуры, гэтак мне ненавіснай.

Як аказалася, падчас выбарчай кампаніі наш «Авадзень» сваімі хвалебнымі публікацыямі ўсяляк садзейнічаў прыходу да ўлады вялікага прайдзісвета. Неўзабаве пасля яго перамогі на выбарах «Авадня» прызначылі галоўным рэдактарам «Губернскіх навінаў». Праз год — загадчыкам аддзела інфармацыі ў абласной адміністрацыі, а яшчэ праз паўтары гады — намеснікам губернатара па дэмагогіі. (Прашу прабачэння, абмовіўся, — ідэалогіі, вядома.)

Час ад часу мы бачыліся з ім на афіцыйных мерапрыемствах. З «Аваднём» адбыліся ашаламляльныя перамены. Ён пастрыг свае арыйскія кучары і пагаліў бародку. Апрануўся, як след, вядома. Набыў абавязковую для чыноўнікаў гэтага рангу ўкормленасць.

Першы час, будучы яшчэ рэдактарам «Губернскіх навінаў», пры нашых сустрэчах ён выяўляў уласцівую яму гуллівую ветлівасць, у якой, як вадзяны знак, ужо праяўлялася яго смешная важнасць будучых часоў.

Наступным актам стала шырокамаштабная траўля мяне ў мас-медыя. Апублікаваўшы ў цэнтральнай прэсе шэраг крытычных артыкулаў аб некаторых выхадках мясцовых уладаў, — звычайныя, у агульным, для мяне матэрыялы, — я, да свайго здзіўлення, стаў героем шматлікіх «памфлетаў». Велізарныя, на газетную старонку, яны на працягу некалькіх дзён выскоквалі — то там, то сям — на целе як «гасударавых», так і «гаспадарскіх» камерцыйных, мясцовых сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, якія трымалі нос па ветры.

Больш за ўсё ў гэтых публікацыях мяне здзіўляла канцэнтрацыя хлусні і яе аўтарства. Было ўражанне, што супраць мяне паўстала ўся журналісцкая брація. Нават тыя, каго я лічыў сваімі сябрамі, паспяшаліся засведчыць свой удзел у, так бы мовіць, грамадскім пакаранні.

Далей — больш. Неўзабаве я і мае публікацыі сталі галоўнай тэмай ідэалагічных нарад у мэрыі і ў адміністрацыі губернатара. На іх, як мне стала вядома пазней, «Авадзень» і яго падручныя натхнёна вынаходзілі сродкі барацьбы са мной, — пакуль яшчэ легальныя.

Мяне паўсюль пазбавілі акрэдытацыі. Мой рэдактар быў завалены гнеўнымі лістамі абураных чытачоў, яго перыядычна атакавалі па тэлефоне рознага роду «грамадскія абвінаваўцы».

«З'ехалі б вы куды-небудзь», — перадавалі мне пры сустрэчы параду «Авадня» падначаленыя яму чыноўнікі. Спецыяльныя службы пачалі бессаромна праслухоўваць мой тэлефон. Спрабавалі даць хабар. Падаслалі непаўнагадовую куртызанку (я ўжо быў асцярожны). Нацкавалі крымінальнікаў, і я быў вымушаны пачаставаць іх разрадам ручной электрычнасці. А таксама, крыху, ангельскім боксам (хук справа, хук злева)...

І за ўсім гэтым быў ён. Ён!

Здавалася, што дзень і ноч ён сочыць за маім быццём. І гэта, прызнацца, было непрыемна. Да агіды.

Нарэшце, ён не вытрымаў і патэлефанаваў мне сам.

«Я б мог цябе знішчыць», — пачуў я, падняўшы слухаўку. «Хто вы?» — здзівіўся я, не пазнаўшы яго. — «Ты ведаеш», — адказаў мне сапраўды надзвычай знаёмы голас. — «Так, так, цяпер здагадваюся». — «Дык вось, слухай уважліва: ты павінен спыніцца, не пісаць усю гэтую хлусню пра прыстойных людзей. У іншым выпадку — наракай на сябе. Я цябе папярэдзіў». — «Я меркаваў, што гэта вашыя, даруй божа, «пісьменнікі» вартыя такіх абвінавачванняў...» — адказаў я ў слухаўку, але мяне ўжо не слухалі...

На шостым годзе дыктатуры зачынілі цэнтральную газету, у якой я працаваў (зрэшты, як і іншыя прыватныя выданні, якія ўсё яшчэ дазвалялі сабе іншы погляд на рэчы). Апынуўшыся без справы, я заняўся пісьменніцкай працай. Балазе, інтэрнэт, з дапамогай якога я стаў рассылаць свае апавяданні, па-ранейшаму дазваляў мне адчуваць сябе свабодным чалавекам. Толькі цяпер я быў не летапісцам свету, а сам ствараў светы. Жывыя, яркія, свабодныя...

...Не ведаю пакуль, чым скончыцца тая непрыгожая гісторыя, але канец маёй life history ўжо набліжаецца. Сусветная літаратура ўстрывожаная. Пушкін узяў у рукі пудовы кій. Чэхаў надзеў пенснэ. Талстой устаў з-за стала. Купала загадкава ўсміхнуўся. Колас нешта сказаў, але не разабраць. Мележ матнуў рукой у бок балота. Пруст прыўзняўся на ложку, абапёршыся на руку. Джойс адсунуў ад сябе шклянку з віскі. Гесэ рассыпаў бісер, у які гуляў...

Усе чакаюць ад мяне завяршальных высноў. Але я не ведаю, што сказаць, як апраўдаць давер. Можа быць, у кожнага, хто жыве на гэтай зямлі, ёсць, як нейкае правіла, свой асабісты ненавіснік (і мой — не самы горшы). У Авеля — свой Каін, у Каіна — свой Авель.

Прынамсі, гэта ўсё б вытлумачвала...

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 3 (103) | 27 сакавіка 2015 | № 12 (429) Новы Час

З кніжкі «Вершы для Хомкі»

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Хомка і люты

Ранкам лютаўскім — галопам,
Снег адкідваючы ў снег,
Паўз гасцініцу «Еўропа»
Хомка з песенькаю бег:

«Люты мусіць быць нялюты,
Люты хай дае цяпло,
Каб ні болю, ні пакуты
Лёгкім лапкам не было!»

Прамінуўшы «Журавінку»
І падумаўшы хвілінку,
Філасофскі свой багаж
Дэманструе Хомка наш:

«Лапы стынуць ад марозу,
Часам нават і ад лёсу,
Што не спраўджвае надзей…
Ды калі казаць сур'ёзна:
Боль слабейшы ад марозу,
Боль ад лёсу ўсё ж мацней!»

Хомка, снегам ахінуты,
Просьбаю душу кране:
«Месяц люты, будзь нялюты
І для ўсіх, і для мяне!»

Хомка-прэзідэнт

Шмат у Хомкі значных дум
І маленькіх думак —
Столькі ж мае ботаў ГУМ
І штаноў, і сумак!

І, вядома ж, столькі ЦУМ
Мае нітак-гумак,
Колькі мае Хомка дум
І ўсё тых жа думак!

З ГУМам побач ён жыве
І паблізу ЦУМа…
Клёк у Хомкі ў галаве
Аж віруе шумам!

Словам, розуму гара,
Як у тых студэнтаў…
Хомку стаць даўно пара
Нашым прэзідэнтам!

Хомка і «герой»

«Я — герой! — крычаў «герой». —
Я — герой герояў!
Я — герой і за гарой,
І перад гарою!

Я — герой і на гары!
Пад гарой і збоку!
Я — герой заўжды, сябры,
Зблізку і здалёку!

Знае гэтая гара,
Неба над гарою,
Што даўно ўжо мне пара
Зорку даць героя!»

Хомка гэтак адказаў
На хвальбу пустую:
«Дайце чмо, каб не крычаў,
Зорку залатую!»

Хомка і родны куст

Еўропа — там, а там — Расія,
А Хомка сам, бо Хомка тут…
І ў тым ягоная і сіла,
Што мае свой і куст, і кут.

Каб мог на мове чалавечай,
То гэтак бы сказаў: «Ці льга
Мне прыліпаць да ласкі нечай
І да чужога пірага?!

Вядома ж, не, а лепш уволю
Пад родным брышкаваць
кустом!
Свой куст — свой кут,
сваё раздолле,
А можна й так сказаць — свой дом…

Хоць тут па-нашаму нічога,
А ўсё па-іхняму, усё —
Пільнуйся век свайго парога,
Трымайся за сваё рыззё!»

Хомка і гісторык-злодзей

Напісаў гісторык працу,
Хомка прачытаў яе,
А пасля давай смяяцца
З працы крадзенай тае!

Не гісторык гэта — гора;
Поле не сваё арэ,
Перапісвае з Кіркора
І ў двукоссе не бярэ!

Хомка і зноў прэмія

У журы свой твор прыпёр
Графаман вядомы;
Ён пад прэмію свой твор
Напісаў, вядома!

Рэцэнзентам грошы даў, —
Тыя ў друку мігам:
«Свет такога не чытаў!
Культавая кніга!!!»

Што ж, за грошы і не так
Дурні славяць дурня…
Як ні выхваляй, аднак
Творык той — халтурня!

Рэцэнзюшнікам на зло
Хомка аддакорыў:
«Прэміі каб не было —
Не было б і твора!»

Хомка, хлопчык, гузікі і гарбузікі

Хлопчык грыз гарбузікі
І спытаў матулю:
«А навошта гузікі
На маёй кашулі?»

І адказ такі дала
Хлопчыку матуля:
«Каб зашпіленай была,
Сынку мой, кашуля!»

Як дагрыз гарбузікі
Хлапчанятка порсткі,
То зірнуў на гузікі,
Што трымалі порткі.

І, вядома, зноўку мог
Папытаць, каб чулі…
Ды Хама тут дапамог
Адказаць матулі:

«Гэта, хлопчык мой, штаны,
Носяць іх мужчыны
(Часам і жанчыны!),
І зашпілены яны,
Нашы слаўныя штаны,
Быць заўжды павінны!»

Хомка, Еўка і Адамка

Бегла Еўка за Адамкам,
І за райскай брамкай
Штуку адпаліў Адамка —
Як вавёрка, скок на дрэўка!
І што ён схаваўся тамка, —
Не ўсачыла Еўка.

Адбылося ўсё знячэўку —
То-бок, мімаволі…
Ён высока быў на дрэўку,
А яна — на доле.

І ад нечаканкі гэткай —
Бачна, што нямілай,
Еўка (ведама, кабетка!)
Крыку нарабіла:
«Ах, мой кручаны Адамка,
Зноў схаваўся, гадзе,
Каб цябе ўшчаміла брамка
Ў гэтым райскім садзе!

Да работы — рукі ў бокі
І на слова — дзікі,
А зашыўся ў кут глыбокі
Ці ў стажок які высокі
Майстар ты вялікі!

От, на гэтым дрэўцы, мусіць,
З дурам радзіш раду…
Змей цябе няхай укусіць
Спераду ці ззаду!»

Толькі так сказала Еўка,
Як Адамка — от жа! —
Куляннуўся гэтак з дрэўка,
Што і ўстаць не можа.

Ці напраўду змей Адамку
Укусіў, ці проста —
Як пачуў праклён пра брамку,
То і стала млосна?!

Дзякуй Богу, ручкі-ножкі
Й макацёр — чын чынам!
Паляжаў Адамка трошкі
І… луп-луп вачыма!

Акрыяў і з Еўкай (жонкай!)
Стаў ён цалавацца…
«Ад жанок, — падумаў Хомка, —
Лепей не хавацца!»

Хомка і Няміга

Дождж ліную з такою сілай
І гвалтоўнасцю такой —
Аж Нямігу затапіла,
Стала зноў яна ракой!

І не дзіва! Што здзіўляцца?!
У стыхіі дух круты —
Гухнула на Менск знянацку
Тоны дажджавой вады!

Тое змылася імгненна,
Што павінна змытым быць;
Завірыла белай пенай,
Белым градам скрозь вірыць…

А як сціхла, — Хомка чынна,
Нібы зняў цылiндр з крука:
«А прыемная карціна,
Што Няміга зноў рака!»

Хомка і бітон

На баку ляжаў бітон,
А ў бітоне тым — батон!
Словам, хтосьці ў той бітон
Толькі што паклаў батон!

Не жэтон, не парасон,
Не кардон, не мікрафон,
А падкінуў у бітон
Свежаспечаны батон!

Морду ўсунуўшы ў бітон,
Хомка ўнюхаў той батон,
Добра знаючы: бітоны
Зроблены не пад батоны!

На ваду яны, на квас
І на малако якраз!..
Пэўна ж, нейкі размантон
У бітон схаваў батон!

Хомка і першы снег

Хомка склаў пра першы снег
Вершык адмысловы,
Два разы было ў ім — эх! —
І такія словы:

«Эх, цудоўны першы снег,
Белыя гірлянды!
П'яныя на лаўцы, эх,
Два міліцыянты!»

Хомка і другі снег

А назаўтра снег другі
Хомка зранку ўбачыў
І без «эх» пачаў: «Снягі
Цешаць дух сабачы…

А яшчэ я вам скажу,
Выхаванец панскі,
Холад радуе душу,
Як і сыр галандскі!»

Хомка і кот

Кот, прыблудны небарака,
Неяк зачапіў Хаму:
«Добра ты жывеш, сабака!
Добра жыць табе чаму?»

Адказаў Хама прыблудзе:
«Мне шанцуе, не таю —
Вельмі добрыя ўжо людзі
Прынялі ў сям'ю сваю!»

Хомка і начная дама

Ноччу Хомка даму прама
Запытаў, як даў пад дых:
«Вы якіх паводзін, дама,
Лёгкіх ці зусім цяжкіх?»

І пачуўшы гэта, дама
Не здзівілася ніяк
І ў адкрытую таксама
Адказала дама прама:
«Прастытутка я, Хамяк!»

Хомка і два мужчыны

Бег па вуліцы дзяўбень,
За дзяўбенем шалупень!
А пасля — у парку леглі;
Леглі разам, як і беглі…

Хомка ад такой карціны
Захацеў і сам паспаць:
«Леглі разам два мужчыны,
Бо стаміліся, відаць?!»

Хомка-музы́ка

Колькі мае лап? Чатыры!
І — усімі чатырма —
І на цытры, і на ліры
Заіграе вам Хама.

Ці гітара-мандаліна,
Ці гармонік — хоць на чым!
І на гэтым піяніна,
А таксама ж і на тым!

Што й казаць — музы́ка ўдалы,
І яму няма цаны!
Можа ўрэзаць і ў цымбалы,
Калі трапяцца яны!

Нотнай азбукі не знае,
Ды, паеўшы корм сухі,
Так зайграе-заспявае,
Што прачнецца і глухі!

Таямнічы цуд

Хорхе ЛУІС БОРХЕС

У ноч на чатырнаццатага сакавіка 1939 года ў пражскай кватэры на Цэльтнергасэ Яраміру Хладзіку, аўтару няскончанай трагедыі «Ворагі», працы «Абвяржэнне вечнасці» і даследавання аб ускосных габрэйскіх крыніцах Якаба Бёмэ, прыснілася доўгая партыя ў шахматы.

За першынства змагаліся не два гульцы, а дзве слаўныя сям'і, гульня цягнулася ўжо некалькі стагоддзяў, і ніхто не мог успомніць суму ўзнагароды, хоць і хадзілі чуткі пра тое, што яна была велізарная, нават незлічоная. Дошка з шахматнымі фігурамі месцілася ў таемнай вежы. У сне Ярамір быў першынцам адной з варожых сем'яў. Бой гадзінніка адзначаў час неадкладнага ходу, Хладзік бег пад дажджом па пясках пустыні і не мог успомніць ні назваў фігураў, ні правілаў гульні ў шахматы. У той самы момант ён прачнуўся. Грукатанне дажджу і жудасны бой гадзінніка спыніліся. З Цэльтнергасэ падымаўся роўны рытмічны шум, які часам перарываўся рэзкімі камандамі. Бралася на дзень. У Прагу ўваходзілі браніраваныя перадавыя атрады Трэцяга Рэйху.

Дзевятнаццатага да ўладаў дайшоў данос. У той самы дзень, на заходзе сонца, Ярамір Хладзік быў арыштаваны. Яго выклікалі у стэрыльна-белы штаб на супрацьлеглым беразе Влтавы. Ён не мог абвергнуць ніводнага з абвінавачанняў гестапа: па лініі маці прозвішча яго было Яраслаўскі, у ім цякла габрэйская кроў, прагабрэйскімі былі і ягоныя даследаванні Бёмэ, у пратэстным лісце супраць Аншлюса фігураваў і ягоны подпіс. У 1928 годзе Хладзік пераклаў «Сэфер Ецыра» для выдавецтва «Герман Барсдорф», выдавецкі каталог з камерцыйнымі мэтамі раздзьмуў славу перакладчыка; якраз гэты каталог і прагледзеў Юліюс Ротэ — адзін з ваенных начальнікаў, у руках якіх знаходзіўся лёс Хладзіка. Няма чалавека, які па-за межамі сваёй сферы дзейнасці не быў бы легкаверным. Двух ці трох эпітэтаў гатычным шрыфтам было дастаткова, каб Юліюс Ротэ прызнаў значнасць Хладзіка і распарадзіўся, каб таго прыгаварылі да смяротнага пакарання pour encourager les autres [каб падбадзёрыць іншых (фр., іранічн.)]. Пакаранне было прызначанае на дваццаць дзявятага сакавіка, дзевяць гадзін раніцы. Гэтая адтэрміноўка (яе значэнне чытач пасля яшчэ ацэніць) тлумачыцца жаданнем адміністрацыі дзейнічаць неперадузята і паступова, падобна да раслінаў і планетаў.

Першым пачуццём Хладзіка быў проста жах. Ён падумаў, што шыбеніца ці плаха яго б не напалохалі так, як расстрэл, які здаваўся проста невыносным. Дарэмна ён паўтараў сабе, што страшны сам факт смерці, а не канкрэтныя абставіны. Ён няспынна ўяўляў гэтыя абставіны, недарэчна спрабуючы вычарпаць усе варыянты. Ён зноў і зноў праходзіў праз гэта, пачынаючы ад бяссоннага світанку аж да містычнага залпу. І да дня, прызначанага Юліюсам Ротэ, ён перажыў сотню смерцяў на падворках, чые формы і куты стамлялі нават геаметрыю, яго расстрэльвалі розныя жаўнеры ў рознай колькасці: адны часам забівалі яго здалёк, іншыя — ва ўпор. Ён з сапраўдным страхам (а магчыма, з сапраўднай адвагай) сутыкаўся з гэтымі ўяўнымі пакараннямі, кожная карціна працягвалася некалькі секундаў, кола замыкалася, і Ярамір кожны раз з дрыготкай вяртаўся да перадпачатку сваёй смерці. Пасля ён прыйшоў да думкі, што рэальнасць не заўсёды супадае з прадчуваннямі і, кіруючыся перакручанай логікай, зрабіў выснову, што ўявіць абставіны ў дэталях — значыць пазбегнуць іх. Верны гэтай убогай магіі, ён выдумляў розныя жудасці — каб яны не адбыліся. Натуральна, ён скончыў тым, што пачаў баяцца, каб яны не зрабіліся прарочымі. Начамі няшчасны Хладзік імкнуўся хоць неяк замацавацца ў хуткаплыннай субстанцыі часу. Ён ведаў, што гэта будзе цягнуцца да світанку дваццаць дзявятага сакавіка, і разважаў уголас: «Цяпер ноч на дваццаць другога; і покуль доўжыцца гэтая ноч (і шэсць наступных начэй), я непераможны, я бессмяротны». Ён думаў, што ночы сну былі глыбокімі і цёмнымі водамі, у якія можна было пагрузіцца. Часам ён нецярпліва і горача жадаў вызначанага пакарання, якое б так ці інакш вызваліла яго ад бессэнсоўнай працы — уяўляць. Дваццаць восьмага, калі апошні захад сонца адбіваўся ў высокіх жалезных кратах, ад гэтых прыгнятальных думак яго адцягнуў успамін пра сваю п'есу «Ворагі».

Хладзіку мінула сорак. Па-за некаторымі сяброўскімі сувязямі і шматлікімі звычкамі яго жыццё зводзілася да даволі праблематычнага занятку літаратурай. Як кожны пісьменнік, ён меркаваў пра годнасць іншых па іх творах, але хацеў, каб іншыя яго судзілі па ягоных задумах і планах. Усе яго надрукаваныя кнігі выклікалі ў ім цяжкае пачуццё расчаравання. У сваіх даследаваннях творчасці Бёмэ, Ібн Эзры і Флада ён бачыў толькі простую старанасць, у перакладзе «Сэфер Ецыра» — нядбайнасць, млявасць і недакладнасць. Не такім убогім ён лічыў хіба толькі «Абвяржэнне вечнасці»: у першым томе апавядаецца пра розныя тэорыі вечнасці, якія вынаходзілі людзі, пачынаючы ад пастаяннага Быцця Парменіда і да зменнага мінулага Хінтана, другі абвяргае (следам за Фрэнсісам Брэдлі) тое, што ўсе з'явы сусвету маюць часавую паслядоўнасць. У ім даводзіцца, што лічба магчымых досведаў чалавека не бясконцая і што дастаткова аднаго «паўтору», каб давесці, што час — гэта падман... На жаль, не менш падманлівыя аргументы, якія выкрываюць гэты падман; Хладзік звычайна перабіраў іх з нейкай пагардлівай няёмкасцю. Ён склаў таксама цыкл экспрэсіяністскіх вершаў, яны — да сораму паэта — з'явіліся ў анталогіі 1924 года, і не было потым анталогіі, якая б іх не перадрукоўвала. Ад усяго гэтага памылковага і бляклага мінулага Хладзік хацеў адкупіцца толькі вершаванай п'есай «Ворагі» (ён аддаваў перавагу вершам, бо яны не дазваляюць слухачам забыцца пра пазарэальнасць, што ёсць умовай мастацтва).

У гэтай п'есе вытрымлівалася адзінства часу, месца і дзеяння. Дзея адбывалася ў Градчанах, у бібліятэцы барона Ромерштата, у адзін з апошніх вечароў дзевятнаццатага стагоддзя. У першай сцэне першага акта да Ромерштата прыходзіць незнаёмец. (Гадзіннік адбівае сем, апошнія гарачыя промні сонца запальваюць шкло, вецер даносіць знаёмыя гукі імклівай венгерскай музыкі.) За гэтым візітам ідуць іншыя, асобаў, якія яго турбуюць, Ромерштат не ведае, але ёсць трывожнае пачуццё, што недзе ён іх ужо бачыў — магчыма, у сне. Усе празмерна ліслівяць яму, але робіцца відавочным — спачатку гледачам драмы, пасля самому барону, — што гэта таемныя ворагі, якія змовіліся знішчыць яго. Але Ромерштат здолеў выкрыць і высмеяць іх складаныя інтрыгі. Раптам у размове закранаюць яго абранніцу, Юлію дэ Вайдэнаў, і нейкага Яраслава Кубіна, які калісь дакучаў ёй сваім каханнем. Гэты, у сваю чаргу, звар'яцеў і лічыць сябе Ромерштатам... Небяспека ўзмацняецца, у канцы другога акта Ромерштат вымушаны забіць змоўшчыка. Пачынаецца трэці акт, апошні. Паступова павялічваецца блытаніна: вяртаюцца героі, якія, здавалася, ужо зніклі з сюжэта, на імгненне вяртаецца чалавек, забіты Ромерштатам. Нехта заўважае ўголас, што вечар не надышоў: гадзіннік б'е сем, у шкле адбіваецца захад сонца, паветра прыносіць палкую венгерскую музыку. Тут з'яўляецца першы госць і паўтарае словы, якія прамовіў у першай сцэне першага акта. Ромерштат без здзіўлення звяртаецца да яго, глядач разумее, што Ромерштат — гэта няшчасны Яраслаў Кубін. Трагедыі не адбылося: гэта проста кругазварот трызненняў, што бясконца перажывае Кубін.

Яго жыццё зводзілася да даволі праблематычнага занятку літаратурай. Як кожны пісьменнік, ён меркаваў пра годнасць іншых па іх творах, але хацеў, каб іншыя яго судзілі па ягоных задумах і планах

Хладзік ніколі не пытаў сябе, была гэта трагікамедыя памылак бессэнсоўнай ці выдатнай, паслядоўнай ці выпадковай. Апісаны сюжэт — ён інтуітыўна адчуваў — быў найбольш зручнай выдумкай для таго, каб прыхаваць свае заганы і падкрэсліць перавагі, магчымасцю выразіць (у сімвалічнай манеры) асноўнае ў яго жыцці. Ён ужо скончыў першы акт і некаторыя сцэны трэцяга; вершаваны характар твора дазваляў перабіраць яго бясконца, шліфуючы гекзаметры без рукапісу перад вачыма. Яму падумалася, што не хапае яшчэ двух актаў, а ён вельмі хутка памрэ. Ён размаўляў з Богам у цемры. «Калі я якім-небудзь чынам існую, калі я не адзін з тваіх паўтораў і памылак, то я існую як аўтар «Ворагаў». Каб скончыць гэтую драму, якая можа апраўдаць мяне і Цябе, мне патрэбны яшчэ адзін год. Дай мне яго, Ты, Той, Каму належаць вечнасць і час». Была апошняя ноч, найбольш цяжкая, але праз дзесяць хвілін сон паглынуў яго, бы цёмная вада.

Да самага світанку Хладзіку снілася, што ён заблукаў у адным са сховішчаў бібліятэкі Клементынума. Бібліятэкар у чорных акулярах спытаў у яго: «Што вы шукаеце?» Хладзік адказаў: «Шукаю Бога». Тады бібліятэкар сказаў яму: «Бог знаходзіцца ў адной з літар на адной са старонак аднаго з чатырохсот тысячаў тамоў Клементынума. Мае бацькі і бацькі маіх бацькоў шукалі гэтую літару, я стаў сляпым, шукаючы яе». Ён зняў акуляры, і Хладзік убачыў вочы, што былі мёртвымі. Зайшоў, каб вярнуць атлас, нейкі чытач. «Гэты атлас бескарысны,» — сказаў ён і аддаў Хладзіку. Той адкрыў наўздагад. І, агаломшаны, убачыў карту Індыі. З нечаканай упэўненасцю ён дакрануўся да адной з найменшых літар. Усюдыісны голас сказаў яму: «Час для тваёй працы дадзены». І тут Хладзік прачнуўся.

Ён успомніў, што сны людзей належаць Богу. Яшчэ Майманід пісаў: калі словы ў сне дакладныя і выразныя, але немагчыма ўбачыць, хто іх сказаў, то яны спасланыя Богам. Ён апрануўся; у камеру ўвайшлі два жаўнеры і загадалі яму ісці за імі.

Хладзіку ўяўлялася, што з іншага боку дзвярэй — лабірынт з галерэяў, лесвіц і пакояў. Рэальнасць аказалася не такой раскошнай: яны спусціліся на задні падворак па адзінай жалезнай лесвіцы. Некалькі жаўнераў — некаторыя ў расшпіленай форме — размаўлялі, разглядаючы матацыкл. Сяржант пагледзеў на гадзіннік: было восем гадзін сорак чатыры хвіліны. Трэба было чакаць, пакуль гадзіннік не пакажа дзевяць. Хладзік, хутчэй абыякавы, чым няшчасны, сеў на абярэмак дроў. Ён заўважыў, што жаўнеры пазбягаюць сутыкацца з ім позіркамі. Каб палегчыць чаканне, сяржант даў яму цыгарэту. Хладзік не курыў, але цыгарэту ўзяў, ці то з ветлівасці, ці то з пакорлівасці. Прыкурваючы, ён заўважыў, што рукі ў яго дрыжаць. Спахмурнела, жаўнеры размаўлялі ціха, быццам ён ужо нежывы. Ён марна спрабаваў згадаць жанчыну, што была прататыпам Юліі дэ Вайдэнаў...

Жаўнеры пашыхтаваліся. Хладзік, стоячы каля сцяны казармы, чакаў залпу. Нехта выказаў занепакоенасць, што сцяна можа запэцкацца крывёю, і асуджанаму загадалі зрабіць некалькі крокаў наперад. Недарэчна, але Хладзіку гэта нагадала прыгатаванні перад здымкамі. Цяжкая кропля дажджу ўпала яму на скронь і павольна пакацілася па шчацэ. Сяржант выкрыкнуў апошнюю каманду.

І тут навакольны свет застыў.

Зброя была скіраваная на Хладзіка, але людзі, якія збіраліся яго забіць, знерухомелі. Рука сяржанта замерла ў незавершаным жэсце. На каменнай пліце падворка адбіваўся нерухомы цень ад пчалы. Вецер спыніўся, бы на карціне. Хладзік паспрабаваў крыкнуць, вымавіць слова, варухнуць рукою. І зразумеў, што спаралізаваны. Да яго не даходзіў нават самы слабы гук скамянелага свету. Ён падумаў: я ў пекле, я мёртвы. Ён падумаў: я звар'яцеў. Ён падумаў: час спыніўся. Пасля Хладзік узважыў, што ў такім выпадку думка б таксама спынілася. Яму захацелася гэта праверыць: паўтарыў (не рухаючы вуснамі) загадкавую чацвертую эклогу Вергілія. Ён уявіў, што далёкія жаўнеры падзяляюць яго трывогу: яму вельмі захацелася паразмаўляць з імі. Хладзіка здзівіла тое, што ён не адчувае ніякай стомы, нават млоснасці ад доўгай нерухомасці. Неўзабаве ён заснуў. Калі ён прачнуўся, свет па-ранейшаму быў нерухомы і нямы. На яго шчацэ па-ранейшаму заставалася кропля вады, на пліце — цень пчалы, дым цыгарэты, якую ён кінуў, так і не растаў. Прайшоў яшчэ «дзень», перш чым Хладзік зразумеў.

Ён прасіў у Бога год, каб скончыць сваю працу: Усёмагутны даў яму год. Бог зрабіў для яго таямнічы цуд: яго заб'е нямецкая куля, заб'е ў вызначаны час, але ў галаве яго паміж загадам і выкананнем загаду пройдзе год. Ягоная разгубленасць перарасла ў надзвычайнае здзіўленне, здзіўленне — у пакорлівасць, пакорлівасць — у нечаканую ўдзячнасць.

У яго не было на чым пісаць, акрамя памяці. Завучванне кожнага новага гекзаметра надавала яму шчаслівае адчуванне дакладнасці, пра якое не здагадваюцца тыя, хто прыдумляе і тут жа забывае невыразныя і выпадковыя радкі. Ён працаваў не для нашчадкаў, нават не для Бога, чые літаратурныя густы ён ведаў дрэнна. Скрупулёзны, нерухомы, таемны, ён уплятаў у час свой высокі нябачны лабірынт. Два разы ён перарабляў трэці акт. Адмовіўся ад некаторых занадта відавочных сімвалаў: паўторнага бою гадзінніка, музыкі. Нішто яго не хвалявала. Ён апускаў, скарачаў, пашыраў; урэшце ён аддаў перавагу першапачатковай версіі. Яму пачалі падабацца падворак, казарма, твар жаўнера насупраць змяніў яго ўяўленне пра характар Ромерштата. Ён адкрыў, што цяжкія какафоніі, якія так хвалявалі Флабэра, — проста візуальныя забабоны, слабасці і перашкоды слова пісьмовага, але не слова, якое гучыць... Ён скончыў сваю п'есу: не хапала толькі аднаго эпітэта. Хладзік знайшоў і яго. Кропля вады пакацілася па яго шчацэ. У яго вырваўся звар'яцелы крык, ён павярнуў твар, чатыры кулі павалілі яго на зямлю.

Ярамір Хладзік памёр дваццаць дзявятага сакавіка, у дзевяць гадзін і дзве хвіліны раніцы.

Пераклад з гішпанскай Ганны Качалка.
«Прайдзісвет», № 15

Адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная юбілею Уладзіслава Галубка, – «Беззапаветнае служэнне народу». Значнасць кожнага падобнага форума абумоўліваецца ў многім імёнамі яго ўдзельнікаў. Не трэба дататкова тлумачыць, якое месца ў сучаснай гуманітарнай навуцы Беларусі займаюць Аляксандр Лакотка, Сцяпан Лаўшук, Аляксандр Каваленя, Рычард Смольскі, Людміла Пятрова…

З гэтай прычыны вялікае значэнне набывае рэзалюцыя, якая была прынята па выніках канферэнцыі. Ужо сам факт падобнага дакумента ў актуальным беларускім дыскурсе па меншай меры нечаканы, а яго змест мае значэнне агульнадзяржаўнае.

Не будзем галаслоўнымі. Не станем прыводзіць лішні раз цытаты з дакумента. Падамо рэзалюцыю ў поўным аб'ёме. Балазе, яна таго заслугоўвае.

Анатоль Трафімчык

Рэзалюцыя

Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Беззапаветнае служэнне народу: да 130-годдзя з дня нараджэння першага народнага артыста Беларусі Уладзіслава Галубка»

1. Сучаснае тэатральнае жыццё ў краіне вызначаецца даволі ўстойлівым працэсам творчага развіцця і ўзбагачэння лепшых традыцый нацыянальнай культуры беларусаў. Сведчаннем таму – шматлікія і рэгулярныя прэм'еры паводле твораў класічнай і сучаснай беларускай літаратуры і драматургіі, паспяховае сцэнічнае ўвасабленне асобных твораў сусветнай класікі, пашырэнне рэпертуарнай палітры за кошт твораў рускай і заходняй драматургіі, актывізацыя фестывальнага руху, паглыбленне міжнародных тэатральных сувязей.

Значнай падзеяй для сучаснага айчыннага тэатра стала ўтварэнне Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ініцыятыве Міністэрства культуры і асобных творчых саюзаў «Нацыянальнай тэатральнай прэміі» і правядзенне ў 2011 г. першага конкурсу паводле гэтай прэміі.

2. Аналіз стану сучаснага тэатральнага працэсу адначасова паказвае наяўнасць некаторых праблем у сцэнічным мастацтве, якія замінаюць справе больш паспяховага творчага развіцця і выканання тэатрам сваіх разнастайных і адказных культурных функцый у жыцці чалавека, грамадства, дзяржавы.

Сярод негатыўных з'яў асаблівую занепакоенасць выклікаюць наступныя моманты:

- адсутнасць у краіне спецыялізаванага тэатральнага выдання, што зусім не спрыяе развіццю тэатральнай навукі і тэатральнай крытыкі, так неабходнаму аб'яднанню маладых драматургаў, рэжысёраў, менеджараў, а таксама актыўнай прапагандзе нацыянальнага сцэнічнага мастацтва ў Беларусі і за яе межамі;
- паступовае фарміраванне так званага дырэктарскага альбо менеджарскага тэатра пры відавочным зніжэнні ролі ці ўвогуле адсутнасці мастацкага кіраўніцтва і страце аўтарытэтнасці і ўплывовасці мастацкага савета;
- з'яўленне ў рэпертуары значнай колькасці забаўляльнай нізкапробнай драматургіі ў разліку на так званую «касу», стыхійная камерцыялізацыя сцэнічнага мастацтва;
- бягучая афіша большасці тэатраў характарызуецца адсутнасцю стратэгіі і тактыкі ў пастаноўцы мастацкіх задач пры фарміраванні рэпертуарнай палітыкі;
- адсутнасць цікавасці да распрацоўкі сучаснай праблематыкі ў рэжысуры і драматургіі;
- вострая барацьба пакаленняў і размежаванне ўнутры творчага калектыву, пагардлівасць да маладых кадраў;
- ухіленне кіраўніцтва асобных тэатраў ад планамернага падбору і выхавання творчых кадраў, адсутнасць сістэмнай работы па ўдасканаленні прафесійнага майстэрства трупы;
- небяспечны працэс самаадасаблення тэатраў краіны, імкненне асобных кіраўнікоў кантактаваць з тэатрамі далёкага і бліжняга замежжа і, як вынік, адсутнасць трывалых творчых сувязей паміж тэатрамі ўнутры краіны, інакш кажучы, страта адчування адзінай тэатральнай сям'і.

3. Асновай нацыянальнага сцэнічнага мастацтва Беларусі сёння і ў гістарычнай перспектыве будзе мадэль дзяржаўнага, стацыянарнага, рэпертуарнага, з пастаянняй трупай тэатра. Гэта мадэль даўно і пераканаўча паказала сваю ўніверсальнасць у тэатральнай справе, яна ствараe майстрам сцэны найбольш спрыяльныя ўмовы для плённай творчай дзейнасці, пошукаў, эксперыментаў, здзяйсненняў.

Адначасова неабходна развіваць дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў сферы сцэнічнага мастацтва, ствараць неабходныя ўмовы для ўзнікнення тэатраў іншай формы ўласнасці.

4. З мэтай стварэння спрыяльных умоў для далейшага паспяховага развіцця тэатральнай справы ў пераходны перыяд да рыначнай эканомікі, ушанавання памяці выбітнага дзеяча нацыянальнай культуры беларусаў Уладзіслава Галубка неабходна ажыццявіць наступныя захады:

- падрыхтаваць праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб тэатры і тэатральнай дзейнасці»;
- стварыць зацікаўленымі дзяржаўнымі, грамадскімі і прыватнымі ўстановамі і арганізацыямі спецыяльныя «Фонды падтрымкі тэатральнага мастацтва» ў Мінску і абласных цэнтрах;
- для больш эфектыўнага кіравання ў сферы нацыянальнай тэатральнай культуры разгледзець пытанне аб стварэнні ў структуры Міністэрства культуры асобнага Дэпартамента па справах тэатральнага мастацтва;
- правесці сістэмныя рэформы існуючай сістэмы дзяржаўнага фінансавання сферы тэатральнага мастацтва з мэтай павышэння эфектыўнасці выдаткавання дзяржаўных сродкаў і прыцягнення пазабюджэтных матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых сродкаў;
- арганізаваць выданне навукова-папулярнага, літаратурна-грамадскага часопіса «Беларускі тэатр»;
- пераўтварыць Гасцёўню Галубка ў дзяржаўна-грамадскі Нацыянальны цэнтр сцэнічнага мастацтва імя Уладзіслава Галубка;
- міжнароднаму фестывалю ў Гомелі «Славянскія тэатральныя сустрэчы» надаць імя Уладзіслава Галубка;
- адной з намінацый Нацыянальнай тэатральнай прэміі «За лепшы драматычны спектакль» надаць імя Уладзіслава Галубка;
- утварыць спецыяльныя стыпендыі імя Уладзіслава Галубка для студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Удзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі выказваюць надзею і ўпэўненасць у тым, што аб'яднанне сумесных дзяржаўных, грамадскіх і асабістых намаганняў па вырашэнні пазначаных у Рэзалюцыі канкрэтных праблем і задач дазволіць беларускаму тэатральнаму мастацтву і надалей годна ўносіць важкі ўклад у развіццё і ўзбагачэнне нацыянальнай мастацкай культуры, ушанавання памяці сапраўднага Волата беларускай культуры, якім, безумоўна, з'яўляецца Уладзіслаў Галубок, а таксама ў агульную справу дзяржаўнага будаўніцтва Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе і гістарычнай перспектыве.

Generation «П(ланктон)»

Другая кніга прозы Кірыла Дубоўскага «Planktonus vulgaris» («Логвінаў», 2014), цэнтральнае месца ў якой займае аднайменная аповесць, адразу ж забірае ўвагу дзякуючы тэме, якая там падымаецца. На аповесць ужо ёсць шэраг рэцэнзій і прыватных водгукаў, і такая нетрывіяльная для беларускага аўтара цікавасць тлумачыцца тым, што Кірыл Дубоўскі, цытуючы допіс Андрэя Пакроўскага, аўтара кнігі прозы «Як я перастаў верыць у Дзеда Мароза», на фэйсбуку, «стварыў праўдзівы помнік эпосе і герою нашага часу» (тут і далей пераклад цытат з рускай мовы).

Героем аповесці (ці вялікага апавядання, як назваў яго ў рэцэнзіі «Сіткам пра офіс» Аляксей Стрэльнікаў) Дубоўскага робіцца нядаўні выпускнік ВНУ, які спрабуе знайсці сваё месца ў жыцці, і гэтае месца вызначаецца вельмі проста: першая праца. Скончыўшы ўніверсітэт і не маючы пакуль ніякага працоўнага досведу, Канстанцін Дарожкін «не прыдатны для выканання ніякіх канкрэтных задач», а таму гатовы шукаць працу ў розных сферах, часам не надта звязаных з атрыманай адукацыяй. Аўтара аповесці цікавіць менавіта працоўная гісторыя яго героя, а таму вобраз Канстанціна Дарожкіна раскрываецца толькі ў гэтым вымярэнні. Перад чытачом — малады чалавек, усе думкі якога занятыя пошукам першай працы (а пасля таго, як праца знойдзеная — выжываннем на ёй) і які адначасова хоча займацца літаратурай, але ўспрымае яе ў той самай катэгорыі «пошукі працы». Ён адчувае ў сабе літаратурны талент, аднак ставіцца да яго практычна: найперш яго цікавіць магчымасць зарабляць літаратурай.

Калі разглядаць Канстанціна Дарожкіна не столькі як літаратурнага героя, які мае пэўныя рысы і дзейнічае ў адпаведнасці са сваім характарам, а як абагулены тып, атрымаецца наступная карціна. Малады чалавек са звычайнай сям'і з пэўнай, а таму не самай запатрабаванай (у дадзеным выпадку, эканамічнай) адукацыяй без досведу працы і карысных сувязяў, спрабуе ўладкавацца на працу, каб атрымаць фінансавую незалежнасць ад бацькоў. Ён верыць, што «першую працу не абавязкова шукаць кепскую і бесперспектыўную, калі можна адразу добрую», аднак у выніку менавіта кепскія яму доўгі час і трапляюцца.

Такі абагулены вобраз выпускніка ВНУ атрымаўся ў аўтара вельмі ўдала: пачатак яго кар'еры можна назваць тыповым для таго гарадскога пакалення, што нарадзілася ў першай палове 80-х (магчыма, нават пазней, да пачатку 90-х), школьную і вышэйшую адукацыю атрымлівала ў 1990-2000-х і пачало сваю працоўную кар'еру ў апошнія 10 гадоў, магчыма, пару гадоў таму. Стартавасць гэтаму пакаленню, дакладней, тым яго прадстаўнікам, якія не трапілі пад размеркаванне і шукалі працу самастойна, часцей за ўсё даводзілася менавіта такім «офісным планктонам». Дзякуючы пазнавальнасці жыццёвага сцэнару аповесць выклікае ў тых чытачоў, якія перажылі нешта падобнае, моцны эмацыйны водгук: яны прымерваюць на сябе калі не вобраз галоўнага героя, то яго абставіны, і ў яго праблемах з працаўладкаваннем пазнаюць тое, што перажылі самі.

Гэтае пакаленне «стабільнасці», якому ад Савецкага Саюза засталася толькі настальгія бацькоў, якое слаба памятае, як грамадства хістала ў 90-х, і якое ўжо дакладна не брала ў гэтых хістаннях ніякага ўдзелу, пакаленне, якое мала цікавіцца палітыкай, нагадвае апісанае ў 1991-м амерыканскім пісьменнікам Дугласам Коўплендам «Пакаленне X». Народжанае бэбі-бумерамі, якія прыйшлі ў свет у ЗША пасля Другой сусветнай, дабілася трывалага дабрабыту і трымалася за ідэалістычныя погляды і сямейныя каштоўнасці, гэтае пакаленне, сталенне якога прыпала акурат на 90-я, ужо не мела ані магчымасцяў, ані ідэалізму сваіх бацькоў. У рамане «Пакаленне X» Дуглас Коўпленд апісвае быт «іксераў» — «з адсутнасцю прывабнай кар'еры і візначаных жыццёвых перспектываў, з неўладкаванасцю, якая, праз адсутнасць альтэрнатываў, паступова ператвараецца ў жыццёвае крэда, што спалучае іронію ў дачыненні да грамадства з бездапаможнасцю перад яго тварам, непрыняцце ніякіх каштоўнасцяў — з поўнай адсутнасцю ўстаноўкі на пратэст» (Ілля Кармільцаў, «Пакаленне Ікс: апошняе пакаленне?»).

Як і Коўпленд, Кірыл Дубоўскі апісаў сцэнар жыцця, характэрны для яго асяроддзя, гэта калі не яго ўласная гісторыя, дык сінтэз гісторыяў, якія здараюцца на кожным кроку. Гэтая аповесць — пра жыццё сучаснага гарадскога чалавека, з максімальнай рэалістычнасцю і лаканічна апісаная ў адзначанай Аляксеем Стрэльнікавым жж-манеры. Найпершае значэнне кнігі ў тым, што яна фіксуе досвед пакалення «стабільнасці», аднак аповесць так і не выходзіць за межы чыстага апісання сітуацыі. Аўтар занатоўвае свой досвед, аднак ніяк яго не падагульняе і не аналізуе, фактычна гэта зляпак з рэальнасці, які не дае ані перадгісторыі, ані тлумачэнняў, ані намёкаў на працяг.

У сваім допісе пра «Planktonus vulgaris» Андрэй Пакроўскі зазначае, што «эпоха і героі нам дасталіся нейкія панылыя». Панылаць герояў — акурат з той самай адсутнасці канфлікту ў сітуацыі і адсутнасці ўстаноўкі на пратэст, якой вылучаецца коўплендаўскае «пакаленне X». Разгублены ад цьмянасці сваіх перспектываў, Канстанцін Дарожкін прымае прапанаваную яму рэчаіснасцю мадэль жыцця. Яго прага займацца літаратурай (дакладней, зрабіць літаратуру сваёй прафесіяй) застаецца нерэалізаванай. Адзіны для яго выхад — шукаць добрую працу далей. Магчыма, гэта ў яго ўрэшце і атрымалася.

Ганна Янкута

«Песні ранняй вясны»

Вясна паціху пачынае ўсталёўвацца на адталых айчынных прасторах.

Яшчэ шмат пасляснежнай вады і гразі, аднак сям-там падсыхае і лапінамі пачынае вылазіць трава, а на вербах набухаюць пупышкі… Тым часам і літаратурны працэс бурліць вурклівa да самазабыўнасці. Асабліва ў электронных сетках. Здаецца, сёння ўсё, апроч нараджэння і смерці, змяшчаецца ў інтэрнэце. Бадай што і сам Фёдар Дастаеўскі, напэўна, быў бы здзіўлены, што чалавека так хутка *«звузілі»*… А між тым, на кожным кроку праблемы. Дайшло й да «дыскрымінацыі» — падумаць толькі! — рускай мовы ў беларускай літаратуры. М-да… А на адной з нядаўніх імпрэз С. Дубавец нечакана заяўляе, што вось змагаўся ён з саветчынай і «рускім мірам», але сёння, як бы тое не выглядала дзіўным, перад пагрозай магчымай вайны, *амаль* гатовы вылучыць некалі зацяганы стары партыйны лозунг: з кім вы, майстры культуры?! Трохі ўтрырую, але блізка да таго. І дарэчы, сам з падобнай пастаноўкай пытання таксама *амаль* пагаджаюся. Агулам — запальных спрэчак і палемікі шмат, тусовачнага апломбу праз край, эгацэнтрычнасць зашкальвае, а высокамастацкай літаратуры — вобмаль… Ды, дзякаваць Богу, усё ж зрэдзьчас з'яўляецца. Вось вакол такіх паасобных твораў і распальваць бы палеміку, «ламаць пер'е», разгалошваць чуткі пра іх, пашыраючы абсяг прыхільнікаў краснага пісьменства.

Часопіс «Дзеяслоў» — адно з тых рэдкіх выданняў, якое намагаецца быць на вастрыі літаратурнага, а не калялітаратурнага, працэса. Не заўсёды атрымліваецца трымаць раўнавагу, але прага мастацкага заўважная. Як і ў чарговым (74) нумары, публікацыі якога пачынаюцца двума аповедамі вядомага пісьменніка **Віктара Казько** пад агульным назовам «Свята мужчынскага смутку». Мудрае, а таму лірычна-іранічнае, асэнсаванне марнасці жыцця сучаснага пост-савецкага чалавека. Што праўда, падчас занадта згушчаны стыль пісьма замаруджвае ход і яснасць думкі і агульнае чытацкае ўспрыманне. Разам з тым, трэба прызнаць, што адвольна і карыкатурна выпісаны вобраз беларускага Моці ў гэтых і папярэдніх аповедах Віктара Казько востра выяўляе крытычную сітуацыю з нацыянальнай і грамадзянскай самасвядомасцю ў нашай краіне. Вось адзін з фрагментаў: *«Але так ужо заведзена — за вялікім чаканнем такое ж вялікае расчараванне. Амаль сусветны падман, разбуральны падман прывабнага снення. Часам незапамінальныя праблескі яго гоняцца за табой у калавароце сумнай рэчаіснасці і помсцяць, помсцяць табе нязбыўнасцю. <…> У якой ступені і меры гэта тычылася яго, Моці, ён не ведаў. Але падсвядома адчуваў такі сэнс, такі вырак усяму жывому на свеце. Гэта адчуванне агарнула яго, калі ён пайшоў у дзіцячы садок»*. Што ж, будзем спадзявацца на выхад асобнай кнігі нашага вядомага пісьменніка пра жыццяпіс нязломнага электаральнага Моці.

Франц Сіўко друкуе маральна-псіхалагічны твор (аповесць «Цымант»), які заводзіць чытача са знешняга, акаляючага нас свету, ва ўнутраны свет чалавека з усімі яго неспадзяванкамі і таямніцамі. Дэтэктыўна-крымінальны стрыжань сюжэту не засланяе агульную і паасобную духоўную карціну чалавечага і грамадскага жыцця. Адказнасць чалавека перад людзьмі не толькі за сябе і свае ўчынкі, але і спроба негалоснага замольвання ім чалавечай грахоўнасці ўвогуле надае тэксту мастацкай вартасці і злабадзённага гучання.

Простыя аповеды пра простыя рэчы і звычайных людзей. Як ёсць. Шмат абрысаў і вобмаль фарбы. Такое, значыць, чорна-белае жыццё і адпаведная яму кароткая проза **Уладзіміра Сцяпана** («Задача», тры навелы). Сухаватая, але чытэльная.

А вось сатырычна-гумарны аповед **Вінцэся Мудрова** («Песні ранняй вясны»), на мой погляд, рэдакцыя магла б прытрымаць і да восеньскага нумара, да пачатку чарговага ўсенароднага выбарчага адабрэння. Цытаваць тэкст можна з любога месца… Я толькі прывяду некаторыя забытыя намі словы, якія паспрабаваў уваскрасіць аўтар: *«удзельнікі польскага падзем'я», «выбарчыя дзяльніцы», «бедалака», «жычкі», «калейка», «бравэра», «запрыдух», «ірты», «брызгуль», «гілос», «трыба», «пушка запалак» і поруч «кубарка сярнічак», «лемзаць», «начвэндзіць», «сутанак», «хваравека», «кіяховы корак», «памяльнік»*… Пры чытанні, дарэчы, успомніўся мне ўласны дзіцячы час пачатку 1950-х гадоў, калі ў заходне-беларускіх вёсках і нават у райцэнтрах пачуць расійскую мову можна было нераўнуючы як насамрэч замежную… Раю і вам акунуцца ў «страхаморлівыя», як піша аўтар, думкі і амаль святочныя чырвонасцяжныя завейныя дзеі таго часу.

Цяжка даць вызначэнне тэкстам **Паліны Качатковай:** ці то гэта напраўду, як яна пазначае, аповеды, ці то журналісцкія нататкі (або ў лепшым выпадку эсэ). У іх ёсць добрая мова, аўтарскі вопытны зрок і слых, але бракуе стылёвай музыкі і адзінства формы і зместу.

З перакладаў прозы трэба адзначыць чытэльную і забаўную аповесць украінскага пісьменніка **Валадзіміра Даніленкі** «Цені ў маёнтку Тарноўскіх» (пераклад Б. Пятровіча), на першы погляд, прымітыўна-праставатую, як самі чалавечыя інстынкты, але і прыцягальную нейкай унутранай, патаемнай, штокроць наспяваючай метафарычнай жарсцю, за якой, бы начная жаночая бялізна, зазыўна мільгаецца код нацыянальнага і фізічнага выраку чалавека. Тэкст з сэксуальнай і эратычнай падкладкай, як кажуць, для вельмі шырокай публікі.

Міні-аповед «Дождж» — сухі, лапідарны, прахалодны скандынаўскі стыль — пэўны, хоць даастатку і недагавораны. *«Я, бачыце, рэгулярна выходжу на шпацыр. На доўгі шпацыр па дажджы. І вось сёння ўдзень я ўбачыў гэтага пацука. Ён папросту патануў. Я ў гэтым не сумняваўся. Ва ўсякім разе ён ляжаў у канаве — нежывы і мокры. Вось яно як, падумаў я. Ты там валяешся, а я тут стаю»*. У гэтым кароткім фрагменце ўвесь высокі сэнс духоўных спасціжэнняў і ўнутраных пертурбацый нарвежскага пісьменніка **Інгвара Амб'ёрнсэна** (апавяданні «Часовая прысутнасць» у перакладзе Лідзіі Ёхансэн).

Што да паэзіі… Вершы вядомага старэйшага паэта **Васіля Зуёнка** лірычныя, але дастаткова мудрыя, без напускной павучальнасці, нібы перад выдыхам — прароча-адчайныя. Як гэты («Д'ябальскае пытанне»):

Не суджана змовіцца двум прарокам,
Адзінства — не іх узаемны дар.
Прарок — як гэты свет — адзінокі.
Ён толькі сам над сабой валадар.
Пракорі ж самі і навучылі —
Несумяшчальнасцю ў мудрых тамах:
Няма прарока ў сваёй Айчыне…
— А можа, Айчыны ў прарока няма?..

Нізка верлібраў **Марыі Вайцяшонак** «Да зімы тварам» вызначаецца тонкай душэўнай вынашанасцю, сатканай з досведу жыцця і духоўнага вопыту. Своеасаблівая метафарычна-вобразная магма жаночай бяссонніцы…

гады падыходзяць
вясковым
разводдзем:
той бераг,
дзе ты,
яшчэ далей
адплывае.

Вершы **Валеры Дубоўскага** («Родавыя аскепкі неба») — пошук формы і стылю для бесперапыннага ўдасканальвання ўласнай асобы. Шмат абстракцый і адстароненасці ад быту дзеля спасціжэння існасці зямнога быцця.

Слова — запісаны сэнс,
занітаваная рэальнасць,
эмоцыя,
якая здабыла абалонку.

Вершы **Таццяны Будовіч** вартыя прачытання, хоць бы таму, што выпадкова занатаваныя ў падсвядомым космасе падчас псіхалагічнай бязважкасці:

сцісні мяне ў далонях
калі паспееш
я твой квіток у іншае вымярэнне
адпачывалі Хічкок з Міядзакі
калі Бог прырабляў мне крылы

Падляшскі беларускамоўны паэт **Андрэй Сцепанюк** (нізка «Бельскае маўчанне») разлічвае на разважлівага чытача. У яго тэкстах амаль нічога не засталося ад традыцыйнага класічнага верша, але, як мне падаецца, яшчэ недастаткова і таго, што спараджае высокае мастацтва. Скажам, аўтар і Паэзія на паўдарозе адзін да аднаго.

З кахання пачнецца Слова
невыразнае і маўклівае
нясмелае і няспелае
Са слова вырасце нескладаны Сказ
граматычна просты
і недасканалы ў форме
Са сказам адкрыюцца Вусны
і горла зробіць праверку Голасу
Голас зварушыць Думку
вырве яе са сну і дрымоты

Даволі аб'ёмная, як для дэбютанта, нізка вершаў «Мая Ітака» мінскага мастацтвазнаўцы **Паўла Дарохіна** пакідае неадназначнае ўражанне. Адукаваны, начытаны чалавек, але хаатычна разбэрсаны ў думках і пачуццях, не зусім падрыхтаваны да гарманічнага ўспрыняцця свету. Паэзія патрабуе мастацкай цэльнасці, калі неабходныя словы паспяваюць за аўтарскай інтуіцыяй. У Паўла ж пакуль падобных удач, мякка кажучы, няшмат.

Маўчу часта, кажу рэдка
Слухайце, дзеткі, страшны сакрэт
Папараць-кветка — не папараць-кветка
Гэта катлетка.
З дзяцінства ўмейце адрозніваць
расліны ад катлет.

Пажадаем і нашаму аўтару навучыцца адрозніваць паэзію ад версіфікацыі.

Пяройдзем, як мне падаецца, да найбольш цікавага раздзела, які можна аднесці да мемуараў, дзённікаў і публіцыстыкі. Да 80-годдзя народнага паэта Рыгора Барадуліна Сяргей Шапран сабраў і падрыхтаваў успаміны пра яго розных людзей. Асаблівую цікавасць выклікае расповед **жонкі паэта Валянціны,** у якім яна даволі шчыра прыпомніла пяцьдзясят тры пражытыя разам гады. Бывала ўсякае, але помніцца найбольш яскравае. Напрыклад: *«Не магу сказаць, што пакахала Грышу за ягоную паэзію — ён спадабаўся мне проста як чалавек. І ўсё жыццё я цаніла яго найперш як чалавека і толькі пасля — як паэта…»*. Далей больш: *«Мову я, канечне, любіла — мову саму па сабе, але да паэзіі была абыякавай. Я не тое, што не люблю паэзію — яна мяне не кранае»*. І напрыканцы трохі дзіўная як для філолага, але, як для самага блізкага чалавека, зразумелая выснова: *«Думаю, што ўсё ж ён быў геніем. І хоць ён са мной не пагадзіўся б, але мне здаецца, што ў беларускай літаратуры менавіта ён першы пісьменнік — наперадзе Багдановіча, Купалы, Коласа. Яны першыя таму, што былі раней за яго, але па ўзроўні першы ўсё-ткі Рыгор»*…

Да ўспамінаў Валянціны Барадулінай дадаліся цёплыя словы **Г. Бураўкіна, сястры В. Быкава Валянціны, лонданскага беларусіста А. Макміліна, У. Сіўчыкава і Р. Сітніцы.** Следам публікуюцца *запісы розных гадоў* народнага паэта **Ніла Гілевіча.** Цікава, што пачынаюцца яны з такой рэдакцыйнай вынаскі, якая пасуе да папярэдняга: *«…наконт генія зайздрасці мы, беларусы, можам з балгарамі пацягацца…»*.

Прыцягваюць увагу вельмі жывыя *«гісторыі з савецкага часу»* **Зянона Пазьняка** пра сціплых герояў беларушчыны, вобразы якіх, прапушчаныя праз памяць і сэрца аўтара, вядомага грамадскага і палітычнага дзеяча, як праз трохграннік часу, недзе ў падтэкстах выяўляюць і постаць самога Пазьняка, як неардынарнага чалавека і асобы. Нястомны ратáй нашай літаратурнай нівы **Сяргей Шапран** працягвае перагортваць старонкі новай кнігі «Уладзімір Някляеў. Незавершаная аўтабіяграфія». Чытэльная, між іншым, штука. Дзіўнымі фармалістычна-лінгвістычнымі ўспамінамі падзяліўся з чытачамі **Аляксандр Лукашук** («На вадзе, на зямлі і ў небе»). Калі шчыра, мяне больш уражвалі яго партрэты сучаснікаў у папярэдніх нумарах часопіса. Друкуюцца «алкагольныя эцюды» **Анатоля Астапенкі.** Пра мастака Пётру Багданава піша **Галіна Багданава.** Вядомы літаратуразнаўца, крытык і драматург **Сяргей Кавалёў** рэцэнзуе даволі неардынарную кніжку калегі Ігара Запрудскага «Метафізіка беларускай крытыкі». **Леанід Галубовіч** разважае над зборнікам вершаў беластоцкай маладой паэткі Касі Сянкевіч «Гарбата з незабудак». Завяршаюць публікацыі рубрыка «Дзеяпіс» і змест усіх нумароў часопіса за 2014 год.

Ёсць што пачытаць, шаноўныя. Давайце жыць не толькі хлебам, але і словам. Беларускім. Каб не ўмерці даастатку ні пры якіх раскладах цёмных сілаў.

Вясна ўсё ж!

ЛеГАЛ

Аўтар Карлсана — на шведскай банкноце

Партрэт вядомай на ўвесь свет дзіцячай пісьменніцы Астрыд Ліндгрэн з'явіцца на шведскай банкноце наміналам у 20 крон.

Разам з партрэтам пісьменніцы на банкноце таксама намаляваны кнігі і адна з самых папулярных персанажаў Ліндгрэн — Пэпі Доўгаяпанчоха.

Творы вядомай шведскай пісьменніцы разышліся па ўсім свеце колькасцю больш чым 150 мільёнаў асобнікаў, яны перакладзены на 95 моў, у тым ліку і на беларускую.

Новую банкноту прэзентуюць у кастрычніку 2015 года.

Прафесія «пісьменнік» у Расіі?

У расійскі рэестр прафесій могуць увесці прафесію «пісьменнік».

«Сацыяльная платформа партыі «Адзіная Расія» пачала экспертную працу па падрыхтоўцы магчымых паправак у Працоўны кодэкс, а таксама ўвядзенню ў рэестр прафесіі «пісьменнік». Гэта можа паслужыць зыходным пунктам для перагляду ставак мінімальнай аплаты працы літаратараў», — заявіў журналістам віцэ-спікер Дзярждумы Расійскай Федэрацыі Сяргей Жалязняк.

Паводле слоў дэпутата, такое рашэнне неабходна ў святле таго, што руская літаратура аказала «велізарны ўплыў на сусветную цывілізацыю».

Самыя высокааплатныя...

«Forbes» апублікаваў рэйтынг самых высокааплатных пісьменнікаў свету.

Рэйтынг складзены па выніках года з чэрвеня 2013 па чэрвень 2014. Першае месца заняў амерыканец Джэймс Патэрсан, аўтар дэтэктываў і трылераў. Ён напісаў серыю кніг пра інспектара Алекса Кроса і дэтэктыва Майкла Бенета, а таксама больш за дзесяць раманаў у серыі «Жаночы клуб расследаванняў забойстваў». Яго ганарар за 12 месяцаў склаў $ 90 млн, а за апошнія дзесяць гадоў Патэрсан зарабіў $ 700 млн.

Нагадаем, што летась Дж. Патэрсан заявіў пра намер раздаць 1 мільён даляраў на дабрачынныя мэты і дапамогу выдавецкаму бізнесу. З таго часу ён ужо ўручыў гранты амаль на палову згаданай сумы. Сродкі кнігагандляры збіраюцца ў асноўным выдаткаваць на рамонт і набыццё тэхнікі, арганізацыю бясплатных сустрэч з пісьменнікамі і раздачу літаратуры сем'ям, якія жывуць за рысай беднасці.

На другім месцы «грашавітага» рэйтынгу Дэн Браўн з заробкам у $ 28 млн, што на $ 6 млн больш, чым летась. Яго кніга «Інферна», выпушчаная ў 2013 годзе, была прададзена ў ЗША ў колькасці 1 млн 400 тысячаў асобнікаў. Цяпер вырашаецца пытанне аб яе экранізацыі.

Трэцяе месца па прыбытках дасталося аўтару дэтэктываў і раманаў пра каханне Норы Робертс. Яе заробак — $ 23 млн., што на $ 1 млн больш, чым у Даніэлы Сціл — аўтаркі класічных жаночых бэстсэлераў.

На пятым месцы з $ 20 млн прыбытку — Стэфані Плам з дэтэктывамі пра прыгоды прадаўшчыцы бюстгальтараў...

Краіна Дон Кіхота

У іспанскай аўтаномнай вобласці Кастылія–Ла-Манча з 2015 года ўсе ахвотныя могуць далучыцца да новага турыстычнага маршрута «Краіна Дон Кіхота» (País del Quijote), створанага па матывах знакамітага рамана Мігеля дэ Сервантэса.

Большая частка кнігі адбываецца менавіта ў гэтай частцы Іспаніі. Так, у Таледа Дон Кіхот пераблытаў рынкавых гандляроў з рыцарамі і прымусіў іх прызнаць Дульсінею Табоскую самай прыгожай дамай у свеце, а гарады Кампа-дэ-Крыптана і Кансуэгра спрачаюцца за права лічыцца месцам «бітвы са шматрукімі волатамі». Экскурсія «Краіна Дон Кіхота» пазнаёміць з іспанскай класікай, даўшы магчымасць засяродзіцца ў атмасферу рамана, які зрабіў вялікі ўплыў на фарміраванне еўрапейскай літаратуры.

У часе маршрута можна ўбачыць цікавыя гістарычныя славутасці гарадоў Таледа і Эль-Табоса, жывапісныя сельскія пейзажы ў рэгіёнах Алькасар-дэ-Сан-Хуан, даліны з ветракамі, пагоркі і старажытныя дарогі, па якіх, паводле твора Сервантэса, некалі падарожнічалі рыцар Дон Кіхот і яго верны збраяносец.

Новы маршрут прымеркаваны да святкавання чатырохсотгоддзя з дня публікацыі другой часткі кнігі, а з 2016 года (да 400-гадовага юбілею з дня смерці Сервантэса) тур папоўніцца новымі аб'ектамі паказу.

ПРЭМІІ

Прэмія імя Шолам-Алейхема

Лаўрэатам прэміі імя Шолам-Алейхема за 2014 год стала Валерыя Багуслаўская, перакладчыца і паэтка, член Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны.



Яна ганараваная за кнігу выбраных перакладаў габрэйскай паэзіі на ўкраінскую мову «Высокае дрэва».

Сёлета міністэрства культуры Украіны вызначыла 5 намінантаў на атрыманне прэміі: Валерыя Багуслаўская, Валадзімір Даніленка, Аляксей Зараховіч, Аляксандр Ласкін і Валадзімір Палішчук. Узнагароджанне было прымеркавана да дня нараджэння габрэйскага пісьменніка — 2 сакавіка.

«Разумееце, я — габрэйка. Я лічу сваім абавязкам, каб засталося на гэтай зямлі тое, што тут было зроблена. У асноўным усе паэты, якіх я перакладаю, гэта выхадцы з Украіны. Або яны тут нарадзіліся, ці тут жылі, або нейкім іншым чынам яны амаль усе звязаныя з Украінай, і гэтая паэзія, якая цяпер на мове ідыш, амаль недаступная. Я хачу, каб яна засталася на зямлі, на той мове, якую гэтая зямля разумее», — распавяла В. Багуслаўская.

Як адзначыў першы намеснік міністра культуры Украіны Ігар Ліхавы, прэмія імя Шолам-Алейхема заснавана распараджэннем Кабінета міністраў Украіны ў 2009 годзе. Узнагарода ў памеры 12 пражытачных мінімумаў за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту прысуджаецца адзін раз у тры гады.

Лаўрэатамі прэміі Шолам-Алейхема могуць быць пісьменнікі, перакладчыкі, сцэнарысты, драматургі — аўтары, якія папулярызуюць духоўна-культурныя дасягненні ўкраінскага і габрэйскага народаў і спрыяюць распаўсюджванню пазітыўнага іміджу Украіны ў свеце.

Гэта была ўжо другая цырымонія ўзнагароджання. Першым лаўрэатам прэміі 2012 года стаў Рыгор Фальковіч за кнігу выбраных вершаў «На скрыжаванні формы і зместу».

Жаночая літпрэмія «Baileys»

Старшыня жаночай літаратурнай прэміі «Baileys» Шэмі Чакраборці пры абвяшчэнні лонг-ліста ўзнагароды наракала на тое, што гендэрныя стэрэатыпы ў свеце літаратуры ўсё яшчэ перашкаджаюць жанчынам.

На думку Ш. Чакраборці, арганізатары прэміі «ніколькі не наблізіліся» да сваёй мэты зрабіць жанчыну паўнавартасным удзельнікам літаратурнага жыцця. «Трэба працягваць падтрымліваць жаночую літаратуру. Падтрымліваць жанчын наогул — няма тут больш магутнага інструмента, чым гісторыі», — адзначыла яна.

У лонг-ліст, у прыватнасці, увайшлі кнігі Элі Сміт, Эн Тайлер, Камілы Шэмсі, Сары Уотэрс і Рэйчэл Каск.

Упершыню прэмію ўручылі ў 1996 годзе. Ідэя заснаваць яе паўстала раней — у 1991-м, калі ў шорт-ліст «Букера» не трапіла ніводная пісьменніца.

Невядомыя вершы Ламаносава

Тры невядомыя раней вершы паэта і вучонага Міхаіла Ламаносава выявілі літаратуразнаўцы Пушкінскага дома (Інстытут рускай літаратуры РАН) пры складанні «Слоўніка рускіх пісьменнікаў XVIII стагоддзя».

«Я супаставіў два дакументы... Адзін паведамляе, што Ламаносаву выдадзена 200 рублёў за падрыхтоўку феерверка ў гонар наступлення 1759 года, а другі — гэта праграмка, якую выдавалі ўдзельнікам свята. Руска-французскі варыянт праграмкі ўтрымлівае віншавальны верш з 20 радкоў, у руска-нямецкім варыянце верша не было. На аўтарства Ламаносава паказвае літаратурны стыль, а таксама супастаўленне біяграфічных дадзеных і аналіз архіўных дакументаў», — падзяліўся здагадкай сакратар Пушкінскага дома Андрэй Косцін.

Феерверк быў уладкаваны на пляжы Петрапаўлаўскай крэпасці. З вокнаў Зімовага палаца яго маглі назіраць удзельнікі навагодняга свята, у тым ліку замежныя паслы.

Два іншыя творы Ламаносава таксама звязаны з феерверкамі: навагодні ў гонар наступлення 1758 года і салют каля палаца графа Пятра Шувалава, які адбыўся 11 чэрвеня 1758-га. «Мы з вялікай упэўненасцю прысвойваем аўтарства Ламаносаву, хоць яго подпіс пад тэкстамі адсутнічае», — адзначыў А. Косцін.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў The Bookseller, The Local Se, Газета.Ru, The Telegraph, The Guardian, Associated Press, novostiliteratury.ru, ТАСС і Newsru.ua.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by